ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 30 (4282)
Пятніца, 5 лютага
1932 г.

МЕНСК, Савецкая 83

Сёньня ў нумары

ПЕРАДАВАЯ — Люты вырашае посьпех ільназагатовак. Дзесяць дзён праверкі падрыхтаванасьці да пасеўнай (1 стар.).

XVII УСЕСАЮЗНАЯ ПАРТКАНФЭРЭНЦЫЯ. Вынікі разьвіцьця прамысловасьці ў 1931 г. і задачы на 1932 г. — Даклад т. АРДЖАНІКІДЗЭ (1-2 старонкі). Дзеньнік канфэрэнцыі (2 стар.).

Ні аднаго калгасу і вёскі бяз сустрэчнага па загатоўках і вывазцы лесу! (3 стар.).

Заданьні трэцяй бальшавіцкай вясны давесьці да кожнай брыгады і калгасьніка (3 стар.).

11,7 проц. гадавога пляну збожжазагатовак выканаць у бліжэйшыя дні! (3 стар.).

Павысіць удзельную вагу сьвіней у загатоўках жывёлы (3 стар.).

Да канца рамонтнай засталіся лічаныя дні (3 стар.).

За бальшавіцкае адзінства ўсіх нацыянальных атрадаў пралетарскай культуры (3 стар.).

На аснове замацаваньня посьпехаў конкурсу спараных брыгад змагацца за новыя перамогі (4 стар.).

Тэрыторыя ваенных дзеяньняў пашыраецца (4 стар.).

Люты вырашае посьпех ільназагатовак

У сьвятле агульна-гаспадарчых задач 1932 г., у сьвятле задач далейшага паляпшэньня матар'яльна-бытавых умоў рабочых і працоўных вялікае і надзвычай важнае значэньне набывае выканасовае і поўнае выкананьне ільназагатоўчых пляноў.

Калі іменна з гэтага пункту гледзіць становішча ільназагатовак, дык размах работы і якасьць паступаючага валакна ні ў якай меры нельга прызнаць здавальняючымі.

Рост і ўзмацненьне сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі ставылі ў бягучым годзе больш чым калі-небудзь спрыяючыя ўмовы для рэалізацыі пляноў усіх відаў загатовак, у тым ліку і загатовак ільнавалакна.

Іменна дзякуючы гэтаму мы ўжо заготовілі ў тры разы больш таго, што было загатоўлена на 1 лютага 1931 г.

Нашы посьпехі ў гэтай галіне не падлягаюць ніякаму сумненьню. Але не падлягае таксама сумненьню і тое, што размах, тэмпы, якасьць загатоўчай работы гэтага году ня можа ісьці ў параўнаньні з мінулым.

«Толькі гнілыя і наскрозь пратухлыя людзі могуць супешацца спасылаўшыся на мінулае» (Сталін).

У разгортваньні загатоўчай работы як у колькасных, так і якасных адносінах трэба выходзіць ня з мінулага, а з узросшых магчымасьцяй, з павышаных тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, з узросшых патрэб працоўных мас.

Больш таго. Аналіз зводак за апошнія пяціднёўкі выразна паказвае на паўтаўнасьць тэндэнцый не павышэньня, а зьніжэньня тэмпаў загатовак. Так, за трэцюю пяціднёўку студзеня загатоўлена 1,5 проц. пляну, за чацьвертую — 0,8 проц., за пятую — 1,4 проц. і за шостую — 1,1 проц. Усяго-ж па БССР да 1 лютага плян рэалізаваны на 52,9 проц.

Адсюль зусім ясна, што тэмпы, якімі зараз разгортваецца кампанія, ня толькі не забясьпечваюць выкананьня пляну ў тэрмін (да 1-га сакавіка), але вядуць да зрыву загатовак гэтага важнейшага віду сырцу.

Гэта тым больш відавочна, калі прааналізаваць рух загатовак па асобных сэктарох.

На 1 лютага калгасамі МТС здала ільнавалакна 50 проц. пляну, іншымі калгасамі — 78,8 проц., аднаасобнікамі — 36,4 проц.; ільнанасеньня адпаведна 72,1 проц., 113 проц., 50,1 проц. пры агульным 69,4 проц.; пяньні адпаведна 0,5 проц., 6,3 проц. і 13,6 проц.

Такім чынам пры агульных яўна нездавальняючых тэмпах надзвычай адстае аднаасобны сэктар. 36,4 проц. — гэта паказчык, аб якім нельга гаварыць бяз трывогі, бо аднаасобны сэктар павінен рэалізаваць 50 проц агульнага задання на ільнавалакну і звыш 50 проц. па ільнасемі.

Прычыны адставаньня аднаасобнага сэктару ў цэлым заключаюцца ў слабым націску на кулака на радзе аснoўных ільнаводчых раёнах. У Крупках, напрыклад, спагнана ўсяго 7 проц. цьвёрдых заданьняў, у Талочынскім раёне — на 15 проц. і г. д. У шмат якіх сельсаветах гэтых раёнаў процант спагнаных цьвёрдых заданьняў даходзіць да 2-1,8 проц. і нават да нуля. У даным выпадку мы маем справу з яўнаапартуністычнай практыкай.

Недаацэнка аднаасобнага сэктару, прывяла ў асобных мясцох да яўнага аслабленьня і нават згортваньня масава-растлумачальнай работы. Гэта работа дзе-ні-дзе падмяняецца «лявацкім» адміністраваньнем, вобыскамі і давядзеньнем цьвёрдых заданьняў да серадняка. Падобныя факты мелі месца ў Віцебскім, Быхаўскім, Глускім і інш. раёнах. Аматары самацёчных тэмпаў, людзі, якія падмяняюць масава-палітычную работу адміністраваньнем і ў той-жа час патураюць кулаку, гэтыя людзі не заўсёды і несвайчасова атрымлівалі адпор.

У гэтым і толькі ў гэтым крыюцца прычыны адставаньня аднаасобнага сэктару. Толькі з гэтай прычыны Талочынскі раён, напрыклад, выканаў плян па аднаасобным сэктары ўсяго на 12 проц., Койданаўскі — на 11 проц., Полацкі — на 16 проц., Бягомльскі — на 8,4 проц., Шклоўскі — на 27,9 проц. і г. д.

Нават і зараз пасьля таго, як рэальнасьць нашых пляноў даведзена на практыцы работы дзесяткаў сельсаветаў, соцень перадавых калгасаў, нават пасьля гэтага ў паасобных мясцох чуюцца пісклівыя галасы апартуністаў, накіраваныя на зрыў кампаніі. У Вушацкім раёне, дзе плян выкананы усяго на 40,4 проц., а за апошнія тры пяціднёўкі прырост складае толькі 0,6 проц., інспектар спабжэньня Лесавік імкнецца навязаць думку аб тым, што плян выкапаць немагчыма. «Добра было-б, — разважае ён, — калі-б даехалі да 50 проц. выкананьня пляну па ільну». Гэта апартуністычная «язда» павінна быць у корані вытручана.

Толькі ў рашучым націску на кулака, у бязьлітасным змаганьні з правымі апартуністамі і «левакамі», толькі ў барацьбе з недаацэнкай аднаасобнага сэктару, пры шырокім разгортваньні масава-палітычнай работы — толькі ў гэтым закладзена перамога на адным з важнейшых вучасткаў ільназагатовак.

Буксір перадавых сельсаветаў, сацыялістычная перамога калгасаў, арганізацыя працэсаў пераапрацоўкі валакна, правядзеньне цэлага раду масава - палітычных мерапрыемстваў — такавы канкрэтныя шляхі заваяваньня перамогі. Сацыялістычны сэктар у гэтай важнейшай рабоце далёка не заняў таго месца, якое яму па праву належыць. Замест 90 проц. паводле пляну, калгасы МТС далі 50 проц. і астатнія — 78,8 проц. ільнавалакна. Па пяньці плян выкаван першымі на 0,5 проц., і другімі — на 6,3 проц. Некалькі лепш ідзе загатоўка ільнасемя, але і тут у наяўнасьці адставаньне. Замест 100 проц. калгасы, МТС далі пакуль што толькі 72,1 проц. пляну.

Слабасьць масава-растлумачальнай работы, паяўнасьць дзе-ні-дзе «лявацкай» ідэалізацыі калгасаў, адсутнасьць у радзе месц дзейснай барацьбы з кулацка-рвацкімі тэндэнцыямі, з асяданьнем валакна на месцы — такавы ў аснoўным прычыны слабых тэмпаў загатовак па сацыялістычным сэктары.

Таму іменна выразная арганізацыя работы, правільная расстаноўка сіл, поўная нагрузка сушыльных і мяльна-трапальных пунктаў, укараненьне прэміяльна-зьдзельнай аплаты ва ўсе працэсы пераапрацоўкі павінны быць пастаўлены не як мерапрыемствы тэхнічнага парадку, а як задачы сугуба палітычнага значэньня.

Увагу і сілы партыйных, камсамольскіх ячэек, сельсаветаў, кіраўніцтва калгасаў — на пераапрацоўчыя пункты! Перанесьці цэнтр цяжару работы ў брыгаду мяльшчыкаў, трапальшчыкаў — такі лёзунг дня!

Вопыт Гарадоцкай МТС, вопыт работы калгасаў Калашаньскага сельсавету, Лёзьнянскага раёну, вучыць не толькі таму, як трэба арганізоўваць работу па пераапрацоўцы, але ён паказвае, як павінны працаваць загатоўчыя пункты і асобныя загатоўцы. Перавагі сацыялістычнага сэктару даюць магчымасьць перанесьці цэнтр загатоўчай работы ў калгасы. Гэтыя перавагі правільна выкарысталі калешаўскія загатоўцы. Іх вопыт работы варты перайманьня.

Адным з важнейшых паказальнікаў эфэктыўнасьці ільназагатовак зьяўляецца якасьць валакна. Гэты бок работы далёка ня ўсюды пастаўлен на патрэбную вышыню. У радзе месц лён здаецца недаапрацаваным — паўтропам і г. д. Шкоднасьць такой работы відавочна. Адсюль ясна, што і барацьба за якасьць павінна быць пастаўлена ў разрад баявых і важнейшых задач ільназагатоўчай кампаніі.

Тэрміны завяршэньня ільназагатоўчай работы падыходзяць да канца. **Люты вырашае посьпех гэтай важнейшай кампаніі.**

Гэта патрабуе ад партыйных, камсамольскіх арганізацый сельсаветаў асабліва адстаючых раёнаў і ў першую чаргу ільнаводчых напружаньня ўсіх сіл і энэргіі, мабілізацыі мас калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў на барацьбу за кожны кілёграм ільнавалакна, пянькі, канапель, ільнянога семя.

Дні работы XVII партыйнай канфэрэнцыі павінны быць адзначаны сапраўды рашаючай перамогай.

«Недадача адной тоны ільнавалакна пазбаўляе нашу краіну 5.600 мэтраў лепшай тканіны». Гэтая суровая лічба, лічба закліку ўдарнікаў «Дзьвіны» павінна быць вядома кожнаму калгасьніку, кожнаму аднаасобніку—беднаку і серадняку.

100 проц. пляну — такі павінен быць адказ ударнікам «Дзьвіны». **Ні аднаго савету, калгасу, які не завяршыў ільназагатовак** — з такім выпікам мы абавязаны прыйсьці да фінішу кампаніі — 1 сакавіка.

Дзесяць дзён праверкі падрыхтаванасьці да пасеўнай

Сёньня пачынаецца масавая праверка падрыхтаванасьці да веснавой пасеўнай кампаніі, абвешчаная ЦКК РСІ СССР, рэдакцыяй «Правда» і рэдакцыяй «Соц. земледелие».

Важнейшай умовай падрыхтоўкі да правядзеньня праверкі была пастаўленая задача завяршэньня збожжазагатовак. Аднак, як гледзячы на тое, што праверка падрыхтаванасьці да вясны была перанесена (па БССР) з 20 студзеня на 5 лютага, збожжазагатоўкі на сёньняшні дзень яшчэ канчаткова не завершаны. Апрача таго, мы ня маем за мінулыя 15 дзён колькі-небудзь рашучага зруху ў ходзе апрацоўкі і заготовак тэхкультур, аб чым у пастанове ЦКК РСІ БССР аб генэральнай праверцы было спэцыяльна ўказана.

Плян збожжазагатовак па БССР на 1 студзеня выкаван на 88,3 проц., а загатоўкі тэхкультур на 52,9 проц.

Пасьпяховае правядзеньне загатовак усіх відаў павінна зьявіцца сустаўной часткай усёй работы на працягу генэральнай праверкі. Раёны, сельсаветы, калгасы і саўгасы, якія ня скончылі загатовак ільну, мяса, павінны будуць паставіць у цэнтры ўвагі ўсёй грамадзкасьці — поўнае выкананьне пляну загатовак.

Мы сёньня ня можам надаць дакладных лічбаў аб стане падрыхтаванасьці да пасеўнай па ўсёй рэспубліцы, але той факт, што Наркамзем БССР мае весткі толькі аб ходзе рамонтнай кампаніі, а па іншых мерапрыемствах раёны маўчаць, — сьведчыць, што на мясцох зроблена надзвычай мала.

Цэнтральнай задачай падыходзячай веснавой сельска - гаспадарчай кампаніі зьяўляецца барацьба за поўнае выкананьне сельска-гаспадарчага пляну і павышэньне якасных паказальнікаў па сельскай гаспадарцы. У пастанове СНК і ЦК КП(б) аб веснавой пасеўнай кампаніі задачы падрыхтоўкі пастаўлены выразна, канкрэтна. У падыходзячую вясну павінна быць засеяна 2.850 тыс. га яравых пасеваў, ураджайнасьць на збожжавых павінна на 12 проц., травах і тэхкультурах — на 18 проц., бульбе — на 20 проц. і прадукцыйнасьць жывёлагадоўлі павялічана на 20 проц.

Выкананьне гэтых колькасных і якасных паказальнікаў магчыма толькі пры ўмове мабілізацыі ўсёй грамадзкасьці калгасаў і саўгасаў на аўталяньне агратэхнікай, напружанай работы па арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў, — цэнтральнай задачы на даным этапе калгаснага будаўніцтва, пры ўмове рашучай перабудовы работы саўгасаў і МТС і рэалізацыі ва ўмовах саўгаснай і калгаснай вытворчасьці 6 указаньняў тав. Сталіна.

Барацьба за якасьць работы і за паўнае выкананьне ўраджайнасьці патрабуе своячасовага пасеву, правільнай апрацоўкі глебы і ўгнаеньняў, увядзеньня севазваротаў, пасеву чыстагатунковым насеньнем, спраўнага інвэнтару і г. д. Гэта значыць, што ўсе гэтыя мерапрыемствы павінны быць падрыхтаваны за сімовы парыц, каб у перыяд сяўбы не стварыць лішняй напружанасьці, якая б'е на якасьці работы і па ўраджайнасьці.

Ва ўсёй падрыхтоўчай рабоце да пасеўнай кампаніі генэральная праверка набывае асаблівае значэньне. Забясьпечыць паварот усёй грамадзкасьці да пытаньняў пасеўнай — асноўная задача цэнтральных, раённых арганізацый і ўсяго раённага і лізавога друку.

Треба дабіцца, каб у кожным калгасе, саўгасе і МТС была арганізавана праверка і самаправерка. Мабілізаваць на гэту работу ўвесь раённы актыў, камсамольцаў, рабкораў, селькораў і г. д. Асаблівую ініцыятыву павінны праявіць раённыя і насьценныя газэты, якія павінны увязаць усю гэту работу з конкурсам «Правды». Ніводзін насьценгазэты, якая-б не арганізавала рэйду ўдарнікаў па праверцы падрыхтоўкі да веснавой сяўбы, — павінна стаць лёзунгам кожнай насьценгазэты.

Дзесяць дзён праверы павінны прайсьці пад знакам мабілізацыі найшырэйшых мас калгасьнікаў і рабочых саўгасаў вакол вуслых пытаньняў пасеўнай. Мабілізаваць іх на практычную работу і ў першую чаргу на своячасовае выкананьне пляноў па ўсіх відах загатовак.

Дзесяць дзён павінен даць рашучы зрух у ходзе рамонтнай кампаніі, якая зараз праходзіць надзвычай павольна. Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на падрыхтоўку і ўмовы зімоўкі поплаха парку. Стварэньне фуражных фондаў, рамонт збруі, правільны догляд каня і ліквідацыя абязьлічкі, — так трэба рыхтаваць **конскі парк да вясны.**

Саўгасы павінны рашуча пакончыць з самацёкам, які існуе ў справе набору рабочай сілы. Указаньне тав. Сталіна аб арганізаваным наборы рабочай сілы на аснове дагавораў о калгасамі павінна стаць правілам для кожнага саўгасу.

У той-жа час неабходна дабіцца, каб кожны калгас ня меншую ўвагу аддаў пытаньням падрыхтоўкі кадраў (брыгадзіраў, вучотчыкаў, паляводаў і г. д.).

Немалаважнае значэньне ва ўсёй гэтай рабоце адыгрывае вытворча-фінансавы плян калгасаў. Рашуча дабіваючыся выканасьці ва ўсёй рабоце, трэба пастаўць задачу, так, каб на аснове пляну была забясьпечана такая расстаноўка сіл, якая адыграе абязьлічку як у перыяд сяўбы, так і ў перыяд усёй падрыхтоўчай работы.

Посьпех генэральнай праверкі будзе забясьпечан толькі тады, калі кожны ўдзельнік рэйду, брыгада ўдарнікаў зрукі ўсьвядомяць, што іх роля заключаецца ня ў тым толькі, каб забраць весткі, а ў арганізацыі работы на месцы, у неадкладным зьнішчэньні выяўленых недахопаў, аказаньні дапамогі калгасам у практычнай рабоце. Толькі пры гэтай умове праверка апраўдае сябе і калгасы сустрэнуць вясну падрыхтаванымі.

Пасьпяховае правядзеньне веснавой сяўбы будзе забясьпечана толькі тады, калі будзе разгорнута рашучая барацьба з правымі пранага і «левага» апартунізму і прымірэньцтвам да іх за ўсёй падрыхтоўчай рабоце.

На кулаку, які прабуе сарваць пляны падрыхтоўкі да вясны нанесьці руйнуючы ўдар!

Шырока разгорнутае сацпаборніцтва памiж калгасамі, саўгасамі, раёнамі і сельсаветамі на лепшую падрыхтоўку да вясны зьявіцца лепшым залогам таго, што сельска-гаспадарчы плян 4-га заключнага году пяцігодкі будзе выкаваны і перавыкаван.

XVII канфэрэнцыя УсеКП(б)

ВЫНІКІ РАЗЬВІЦЬЦЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ ЗА 1931 ГОД І ЗАДАЧЫ 1932 ГОДУ

ДАКЛАД тав. АРДЖАНІКІДЗЭ

Таварышы, выканаўшы пяцігодкі за чатыры гады, заяўляю, што будаўніцтва фундаманту сацыялістычнай эканомікі нашай краіны, падрыхтоўка да другой пяцігодкі ў вялізарнай ступені залежаць ад таго, як працуе прамысловасьць, як яна працавала ў 1931 г., як яна будзе працаваць у 1932 годзе.

Мне няма чаго тут паўтараць, што сацыялістычная перабудова ўсяго нашага ўкладу залежыць ад разьвіцьця нашай прамысловасьці. Дазвольце перайсьці проста да справаздачнай часткі майго дакладу.

ВЫНІКІ 1931 Г. І ЯГО АСАБЛІВАСЬЦІ

Агульныя вынікі 1931 г.

Таварышы, 1931 год даў далейшы вялізарны рост нашай прамысловасьці. Прырост прадукцыі ўсёй прамысловасьці ў адносінах да 1930 г. складае 21 проц.; у 1931 г. прамысловасьць дала на 27 мільярдаў руб. прадукцыі, у тым ліку цяжкая прамысловасьць—11,8 млрд руб і прырост 28,7 проц.; лёгкая прамысловасьць—7.600 млн. руб., прырост 12,6 проц.; лясная прамысловасьць—2,5 млрд., прырост 12,6 проц.; прамысловасьць Наркамзнабу—5 млрд., і прырост 22 проц.

На асобных галінах прамысловасьці мы маем даволі бурны рост такіх галін, як машынабудаўніцтва, даўшае 40 проц. прыросту ў адносінах да мінулага году, у тым ліку варштатабудаўніцтва—73 проц., электратэхнічная прамысловасьць (ВЭО)—61,5 проц., выраб электраэнэргіі ўзрос на 43 проц.; нафтавая прамысловасьць—22,6 проц.; асноўная хімія—17,4 проц.; каменна-вугольная 14,3 проц.; каляровая металюргія — 9 проц., чорная металюргія в цэлым засталася на ранейшым мінулага году, а выраб якасных сталяй узрос у тры разы. Пазасобныя галіны прамысловасьці выкапалі пяцігодку за тры гады: машынабудаўніцтва ў цэлым павінна было даць у пятым годзе пяцігодкі (у 1932-33 годзе)—на 4.350 млн. руб. прадукцыі, а ўжо ў 1931 г. выраблена на 4.730 млн. руб.; электра-тэхнічная прамысловасьць павінна была даць у апошнім годзе пяцігодкі на 895 млн. руб. прадукцыі, а ўжо ў 1931 годзе яна дала на 925 млн. руб.; нафты павінна было быць здабыта 21,7 млн. тон, а фактычна здабыта ў 1931 г. 23,1 млн. тон; тэмовая прамысловасьць у цэлым павінна была даць на 440 млн. руб. прадукцыі, а дала на 461 млн. руб.; вагонаў для НКПЗ на пяцігодцы ў 1932-1933 г. (у двухвосным вылічэньні) —12.600 штук, фактычна ў 1931 г.—29 тысяч штук; трактарнага і с.-г. інвэнтару за тры гады выраблена на 378 млн. руб., г. зн. на 32 проц. больш таго, што намячалася на ўсю пяцігодку ў цэлым (296 млн. руб.).

Гэта—галіны, якія выканалі і перавыканалі пяцігодку за тры гады.

Рад другіх галін, хаця і не дасягнулі такіх рэзультатаў, але ідуць значна вышэй намячанняў пяцігодкі для 1931 году.

Электраэнэргіі на раённых станцыях павінна было быць выраблена 5 млрд. кілёват гадз., фактычна выраблена 6,4 млрд. квт.-гадз.; камэнтнага вугалю на ім было быць на пяцігодцы ў трэцім годзе 53 млн. тон, маем 56 млн. тон; торфу—9 млн. тон, фактычна здабыта 9 з пал. млн. тон; трактараў было прадугледжана вырабіць 8 тысяч, дана 40 тысяч; паравозаў для НКПЗ трэба было выпусьціць 660 штук, выпушчана ў 1931 г. 812 штук; паравых калёў намячалася 145 тыс. кв. мэтраў, выраблена 206 тыс. кв. мэтраў; абутку намечана было зрабіць 60 млн. пар, зроблена 76,8 млн. пар; галёш—51 млн. пар, фактычна выпушчана 53,9 млн. пар; турбін намячалася пабудаваць 300 тыс. квт., пабудавана ў 1931 г. 758 тыс. квт. Гэта, таварышы, галіны, якія ідуць вышэй намячанымі пяцігодкі для 1931 году.

Калі-ж узяць валавую прадукцыю ўсёй прамысловасьці, то і тут мы маем для мінулага году значнае перавышэньне не намячэньняў пяцігадовага пляну.

Валавая прадукцыя ўсёй прамысловасьці ў 1931 г. павінна была скласьці паводле пяцігодкі 19,6 млрд. руб., а ў 1931 г. мы маем 27 млрд. На цяжкай прамысловасьці мы павінны былі мець у 1934 годзе па намячаньнях пяцігодкі 7 млрд., а маем 10 млрд. руб. прадукцыі.

У 1931 г. мы маем рост таксама і на лёгкай прамысловасьці, хаця недахват с.-г. сырцу яшчэ абмяжоўвае гэты рост.

Па вырабе прадметаў шырокага спажываньня мы маем у 1931 г. наступнае: бавоўняна-папяровых тканін—2.246 млн. мэтраў, ваўняных гатовых тавараў—132,7 млн. мэтраў, шаўковых гатовых тканін—18,5 млн. мэтраў, штучнага валакна — 3.774 тоны, прадукцыі швейнай прамысловасьці — на 1.722 млн. руб., трыкатажнай прамысловасьці—на 404 млн. руб., абутку—76,8 млн. пар, галёш—53 млн. пар, мыла гаспадарчага—127 тыс. т. (толькі па ВСНГ). І ў вырабе прадметаў шырокага спажываньня мы маем рост параўнальна з мінулым годам: па ваўняных тканінах амаль на 3 проц., па шаўковых тканінах—на 4,4 проц., па штучным валакне—на 200 проц., але гэта галіна ў нас толькі пачынае разьвівацца. Швейная прамысловасьць дае 53 проц. прыросту, трыкатажная—29,5 проц., галёшы —27 проц., мыла гаспадарчае—13 проц. прыросту.

Побач з вялікім ростам вытворчасьці адбывалася вялізарнае разгортваньне капітальнага будаўніцтва. Капітальныя ўкладаньні ў 1931 г. (а электрыфікацыяй) складаюць 7 млрд. руб., г. зн. больш, чым у папярэднія 2¾ гады, калі было ўкладзена 6.087 млн. руб. Уведзена ў эксплёатацыю новых прадпрыемстваў і агрэгатаў на агульную суму 3,5 млрд. руб., а за папярэднія 2¾ гады было ўведзена на 3.390 млн. руб.

Адначасова з ростам у нас, ва ўсіх капіталістычных сьвеце адбывалася надзвычайнае паданьне вытворчасьці і зрэнжаваньне прадукцыйных сіл. Мы маем прырост у гэтым годзе за 21 проц., чаго ніколі ў самыя лепшыя перыяды ўздыму прамысловасьці ня ведала ні адна капіталістычная краіна. Самы вялікі прырост, які быў у ПАЗШ (меўшых наогул рэкордныя тэмпы ў гісторыі капіталізму) — гэта 5-6-7 проц. Сёньня-ж ва ўсім капіталістычным сьвеце адбываецца жорсткі крызіс, які працягваецца вось ужо больш двух год. Крывая паданьня вытворчасьці імпліва ідзе ўніз. Параўнальна з 1926 годам вытворчасьць панізілася ў ПАЗШ на 31,5 проц., у Германіі—на 16 проц., а ва ўсім капіталістычным сьвеце — на 20 проц. Што-ж робіцца ў нашай краіне? Возьмем таксама за выходны пункт 1926 год, і хаця Ліга нацый значна перапаменшыла наш рост, але малюнак і ў гэтым выпадку апрыміваецца пагражаючы,— у 1926 г. мы мелі 100 проц., потым—127, проц., 147 проц., 170 проц., 198 проц. і ў 1931 годзе 219 проц., а ў сапраўднасьці мы мелі ў 1931 г. ня 219 проц. да 1926 г., як лічыць Ліга, а 279 проц. (Аплёдысмэнты).

Вось, таварышы, рух у капіталістычных краінах і ў нас. Але ці трэба, таварышы, адсюль рабіць такі вывад, што выдатны лёзунг Ільліча «дагнаць і перагнаць» у тэхніка-эканамічных адносінах заходнія-эўрапейскія і амэрыканскія краіны намі ўжо ажыцьцёўлен? Вядома, не. Ня гледзячы на бурны рост нашай прамысловасьці, мы пакуль ад ажыцьцяўленьня гэтага лёзунгу далёкі. Далёкі хаця-б таму, што тых-ж самых ПАЗШ у 1931 г. дадуць 19 мільёнаў тон чыгуну, а мы далі ў 1931 г. 5 млн. Так-ж самая Германія ў 1931 г. дае 6 млн. тон. Правільна, Англія дае 3,7 млн. Але гэта значыць толькі тое, што чорная металюргія Англіі ў 1931 г. адкінута на 70 год назад.

Дагнаць і перагнаць — гэта значыць мець у нас ня менш 42-х млн. тон чыгуну, якія мела Амэрыка ў 1929 годзе.

Аўладаньне новай тэхнікай

Але адзінымі лічбамі колькаснага росту не дасі поўнага малюнку тых якасных зрушэньняў, якія адбываюцца ў нашай прамысловасьці.

Упяршыню ў 1931 г. нам прышлося практычна ўзяцца штыльна за аўладаньне новай тэхнікай і пастаноўку новых вытворчасьцяй як на заводах, якія ў дзейнасьці, так і на новых гігантах, што ўводзяцца ў эксплёатацыю.

Мы ўвялі ў эксплёатацыю ў 1931 годзе на 3,5 млрд. руб. новых прадпрыемстваў. 3,5 млрд. руб.—велічыня сама па сабе даволі грандыёзная, але пры гэтым трэба мець на ўвазе, што ў 1931 г. і ў студзені 1932 г. мы ўвялі ў эксплёатацыю рад вялізарных прадпрыемстваў з навейшай тэхнікай, якія маюць выключнае значэньне для нашага далейшага развіцьця: ніжагародзкі аўтамабільны завод, — на 140 тыс. аўтамабіляў; харкаўскі трактарны завод — на 50 тыс. трактараў; маскоўскі аўтамабільны завод,—на 30 тыс. машын-грузавікоў; першую чаргу ўральскага заводу цяжкага машынабудаўніцтва; саратаўскі завод камбайнаў—на 20 тыс.; завод фрэзэрных варштатаў у Ніжнім Ноўгарадзе—на 12,5 тыс. варштатаў у год; завод рэвальвэрных варштатаў у Маскве —на 6 тыс. варштатаў у год; Уральскі медэплавільны завод — на 20 тыс. тон мелі; пабудаваны за палярным кругам прамысловы горад і разгорнуты распрацоўкі хібінскіх залетытаў; пабудаваны трубчаты і крэкінг, у тым ліку крэкінг сыстэмы савецкіх інжынэраў Шухова і Капялюшнікава; напярэдадні пуску Кузьнецкі металюргічны завод. Сёньня запалена першая домна гігантскай велічыні—магнітагорская, якая ня мае сабе роўнай у сьвеце (аплёдысмэнты). Гэтымі днямі ўводзіцца ў эксплёатацыю першая чарга Беразьнікоў, зіноўскі хімічны завод, саспрасенскі хімічны; у бліжэйшыя два-тры тыдні будзе пушчана «Шарыкаподшыпнік», які дасьць у год 24 млн. падшыпнікаў. Прыступлена да мантажу інструментальнага заводу «Фрэзэр» у Маскве.

Уведзена ў строй 69 вугальных капальняў з гадовай прадукцыйнасьцю ў 28 млн. тон, у тым ліку 4 капальні з гадавой прадукцыйнасьцю па 1 млн. тон кожная і капальня № 5/6 у Прокопʼеўскім раёне, магутнасьцю ў 1,6 тыс. тон.

Электрастанцый уведзена ў гэтым годзе магутнасьцю на 1 млн. кілёват, г. зн. амаль столькі-ж, колькі за два папярэднія гады і столькі-ж, колькі было ў царскай Расіі ў 1913 годзе. З іх важнейшыя станцыі: Штэраўка, далатковa уведзена 93 тыс. кілёват, Кашыра —44 тыс., Іўдрэс—72 тыс.; Біграс—94 тыс.; ленінградская другая — 48 тыс., Зуеўка — на 150 тыс. кілёват; чэлябінская станцыя — 48 тыс. кілёват; магнітагорская — 56 тыс. кілёват; Кізел — 22 тыс. кілёват; Стальдрэс — 24 тыс. кілёват, Даяржынка 24 тыс. кілёват і г. д.

Дзесяць год таму назад у 1921 годзе на III кангрэсе Камінтэрну Ўладзімер Ільліч казаў: «12 тысяч квт.—вельмі скромны пачатак. Быць можа чужаземцы, знаёмыя з германскай і шведзкай электрыфікацыяй, над гэтым пасьмяюцца, але добра сьмяецца той, хто сьмяецца апошнім» (Ленін, том XXVI, стар. 463). Меў рацыю Ільліч, калі ён радаваўся ўведзеным за гады рэвалюцыі 12 тыс. квт. Ён быў упэўнены, што пройдзе не так многа год, калі мы будзем уводзіць мільёны.

Але трэба было ня толькі ўвесьці гэтыя станцыі, трэба было ня толькі пабудаваць тыя прадпрыемствы, якія я вам пералічыў, а куды больш, трэба было гэту высокую тэхніку, якую мы ўвялі з Эўропы і Амэрыкі, пастаўць на службу нашай дзяржаве. Тав. Сталін у мінулым годзе на нарадзе гаспадарнікаў з усёй рэшасьцю паставіў пытаньне аб аўладаньні тэхнікай. І на самой справе, што толку, калі пабудаваць гіганцкія заводы, гіганцкія электрастанцыі, а потым ня ўмець пусьціць іх у ход. Вы ўсе добра памятаеце, як мы цешыліся пуску сталінградзкага заводу, і колькі напружанай работы патрабавалі сталінградзкі завод, перш чым мы яго паставілі на ногі. Высокая амэрыканская тэхніка не адразу нам далася.

Орган германскай сацыял-дэмакратыі —газэта «Форвэртс» ня раз выказвала сваю радасьць, што бальшавікам не ўдаецца справіцца з заводам, узброеным новай амэрыканскай тэхнікай. Орган германскіх меншавікоў злаваў над тым, што хоць горад, дзе пабудаван гэты вялікі завод, і завецца імем Сталіна—сталёвага чалавека, але ўсё-ж такі адной сталёвай волай ня ўзяць гэтай высокай тэхнікі. Аднак, воля бальшавікоў, воля рабочых уладарна пачаўліла сабе гэты гігант і прымушае яго служыць справе сацыялізму выпускаць штодзённа звыш сотні трактараў на калгасныя палі.

З вялікім напружаньнем, з вялікім напружаньнем, але маладыя кадры рабочых, маладыя інжынэры і інжынэры старыя, з энтузіязмам, узяліся за справу з усёй адданасьцю савецкай улады, і зараз мы маем завод поўнасьцю ў нашых руках. Завод у мінулым годзе 30 студзеня даў 37 трактараў, а 30 студзеня 1932 г. ён спусьціў з канверу 130 машын (аплёдысмэнты).

Тав. Птуха мне толькі што перадаваў, што на заводзе зараз ідзе дыскусія аб тым, ці аўтуляецца мяжой праектная магутнасьць—144 машыны ў суткі. Калі мы сёньня маем 130 машын у суткі, то не пазьней, чым у канцы сакавіка, або ў пачатку красавіка мы будзем мець 144 машыны ў суткі.

Я зводзеч з тымі таварышамі з сталінградзкага заводу, якія лічаць, што 144—гэта не мажа. Я ўпэўнены, што рабочыя, інжынэры і тэхнікі сталінградзкага заводу яшчэ раз дакажуць нашым ворагам, што яны ня толькі аўладалі заводам, ня толькі далі поўную прадукцыю магутнасьці, але будуць спускаць з канвеера па 200 трактараў у суткі (аплёдысмэнты).

Ня буду гаварыць аб іншых заводах, дзе нам таксама цяжка было аўладаць высокай тэхнікай. Спынюся толькі яшчэ на хімічнай прамысловасьці. Вы памятаеце, што ў 1930 г. мы мелі рэзкае падзеньне здабычы вугалю за ўсіх вугальных раёнах і асабліва ў Данбасе, дзе здабыча ў лютым—жніўні 1930 г. упала да 70-75 тыс. тон у суткі. З 70-75, з 80-100 тысячамі тон далёка не пойдзеш. Ніякая магутная металюргія на такой базе на стварыш. Увосень 1930 г. рубам было пастаўлена пытаньне аб механізацыі здабычы вугалю. На працягу ўсяго 1931 г. мы біліся над гэтым пытаньнем. Уся партыя, Цэнтральны Камітэт, у асабліваści ЦК Украіны і з прыватнасьці г. Касіёр, які ня выязджаў з канальняў, біліся над вырашэньнем пытаньня механізацыі. Справа пасоўвалася наперад вельмі марудна, але, на шчасьце, вызначыўся зрух. Там, дзе ў мінулым годзе мы мелі 100 тыс. тон, у гэтым годзе маем 140-144 тыс. тон сутачнай здабычы. Гэта бязумоўнае дасягненьне, гэта бязумоўна гаворыць за тое, што мы навучыліся спраўляцца з механізмамі. Але трэба проста сказаць, што і гэтага далёка невыстарчальна. З тымі-ж механізмамі, з той-жа колькасьцю рабочай сілы мы павінны атрымаць куды больш вугалю, чым атрымліваем сёньня. Тут ніякімі агаворкамі адносна таго, што таго не далі, гэтага не далі, нічога ня зробіш. Ва ўсіх вугальных басэйнах у нас ёсьць зараз матар'яльная і тэхнічная магчымасьць даць краіне больш вугалю, чым яны сёньня даюць. Металюргія, транспарт, наогул усе наша гаспадарка на галодным аплазвым пайку далей застацца ня могуць. Апал павінен мець завод, паравоз, апал павінен быць усюды, каб людзі магі спакойна працаваць. Ад работнікаў вугалю залежыць цалкам, як хутка мы гэту справу ўзьнімем.

Урокі сталінградзкага трактарнага заводу, урокі вугальнай прамысловасьці для нашай краіны марна не прайшлі. Чарговы трактарны завод—харкаўскі, ён уже не прыгодзіць доўгую стадыі дзіцячых хвароб. Ён адразу-ж з моманту пуску пашоў досыць плаўна, і сёньня дае 50 трактараў у дзень. Сталінградзкаму заводу для таго, каб даваць па 50 трактараў, патрабавалася 10 месяцаў, харкаўскаму заводу патрабавалася ўсяго на ўсяго 4 месяцы. Гэта ўжо ня так страшна. Я думаю, што харкаўцы падпяцюць і хутка выкуплюць у спаборніцтва са сталінградзкім заводам.

КАСІЁР.—Металь патрэбен, металю не хапае.

АРДЖАНІКІДЗЭ.—Металю не хапае тав. Касіёр? Металь таксама спасьцігнута ў тым раёне, д

XVII канфэрэнцыя УсеКП(б)

ВЫНІКІ РАЗЬВІЦЬЦЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ ЗА 1931 ГОД І ЗАДАЧЫ 1932 г.

Даклад тав. АРДЖАНІКІДЗЭ

Новыя вытворчасьці і новыя галіны

Таварышы, побач з пабудовай новых прадпрыемстваў і аўладаньнем тэхнікай на іх нам прышлося на многіх існуючых заводах кідаць валадараную вытворчасьць і пераходзіць на новыя віды вытворчасьці.

Калек звязацца сельскай гаспадаркі, пераход да буйнага сацыялістычнага земляробства патрабавалі падрыхтоўкі высокай тэхнічнай базы. Мы працавалі далей, але трактар патрабаваў інвентар зусім іншы, чым мы раней выраблялі. Тав. Якаўлеў настойліва патрабаваў гэты інвентар, і прамысловасьць павінна была ў самы кароткі тэрмін даць яго, ня гледзячы на ўсе труднасьці. У кароткі тэрмін с.-г. машынабудаўніцтва перабудавалася і да пасеўнай кампаніі ўжо адолела паставіць немалую колькасьць трактарнага інвентару.

Паводле пяцігадовага пляну сельска-гаспадарчага машынабудаўніцтва мы павінны былі даць прадукцыі за 5 год на 1.860 млн. руб., а іх трактарнага інвентару на 286 млн. За 3 гады далей фактычна прадукцыі на 1.025 млн., а іх трактарнага інвентару—на 378 млн. р. Аб'ём прадукцыі па трактарным інвентары, намечаны на ўсе 5 год, перавыконан за тры гады на 32 проц. За чатыры гады, уключаючы плян 1932 г., с.-г. машынабудаўніцтва дасьць прадукцыі на 1.970 млн. руб., а іх трактарнага інвентару—на 1.058 млн., г. зн. у 3 з пал.—4 разы больш, чым намечана ў агульнай суме за 5 год. Трактарны інвентар павінен быў паводле пяцігодкі скласьці ў 1932-33 г. 26 проц. усёй прадукцыі с.-г. машынабудаўніцтва. Фактычна трактарны інвентар складаў: у 1928-29 г.—4,4 проц. ад усёй прадукцыі с.-г. машынабудаўніцтва; у 1929-30 г.—21 проц., у 1931 годзе — 61 проц. і ў 1932 г.—76 проц.

Што адбывалася ў гэтай галіне? Мы ніколі ў сябе трактарных плугоў, трактарных сэвалак, камбайнаў, ільнацерабілак, бавоўнаўборачных машын, бульбасаджалак і бульбакапалак, віндрофераў і г. д. і г. д. не выраблялі. Нашы заводы ня толькі на ведалі гэтых вытворчасьцяй, але ў пачатку году па радзе машын у нас ня было нават увагі. Трэба было гэтыя ўворы знайсьці, трэба было зьняць з іх чарцяжы, трэба было саматужным шляхам зрабіць першыя экземпляры, потым паставіць іх на масавую вытворчасьць. Да пасеўнай кампаніі і на працу ўсяго 1931 г. мы далі: сеязярак трактарных—82 тыс., малатараць трактарных—77 тыс., сенажасілак трактарных—21 тыс., шопавазалак—14,7 тыс., камбайн "—3 з пал. тыс., віндрофераў —930, падбіральнікаў—592, бавоўнаўборачных машын—1.667 шт., капальнікаў бульбаў трактарных—3.600 шт., трактарных пялежак—16,5 тыс. шт., трактарных сцэпак—66 тыс. шт., бульбасаджалак—2,5 тыс. шт., бульбакапальнікаў конных—11 тыс. шт., кукурузных жнярараў—196, раскідальцаў гною—336, абожжавых элеватараў—402, кормазапарнікаў—1.547, сінарок бавоўтяных—21 тыс. культываторaў трактарных для прапашных культур—4.827, ільнацерабілак—7 тыс. шт., ільнамялак № 5 і 7—3.399, машын для першапачатковай апрацоўкі ільну і іншых лубяных валокнаў (дэкарыкатары, пнеўматурбіны, кудзелазьмяшчальнікі)—1.940 шт. Усе гэтыя машыны або раней не выраблялися ў вас, або выраблялися ў вельмі абмежаванай колькасьці.

Разьвіцьцё у вялізарных разьмерах грузазвароту патрабавала таксама новага рухомага складу. Тое, што было раней, яно ні ў якай меры ў сучасны момант нас не задавальняе. На самай справе, чысьцейшы барбарызм зьяўляецца, калі руду прыходзіцца перавозіць у крытых вагонах. Трэба было паставіць вытворчасьць адкрытых кашоў і плятформ. Трэба было шукаць новыя магутныя паравозы. У 1931 г. у абчежаваных разьмерах было прыступлена да гэтага. Сёе-тое мы далі: гарыкладі: цыстэрн татарскосных мы далі 3.488, а ў 1930 г. іх было дана 676. Плятформ бальшаграузных было 4.556, у 1930 г. іх было дана 942 шт. Паставлена вытворчасьць думкар, кошпраў.

Разьвіцьцё электрыфікацыі патрабавала ад нас, каб мы стварылі сваю магутную машынабудаўнічую базу для яе, прычым трэба было стаміць вытворчасьць навейшых машын. Гэта справа таксама пасунулася наперад. Турбагенэратар магутнасьцю ў 24.000 клв. быў пабудован у нас у 1930 годзе, а пад канец 1931 г. выпушчан турбагенэратар магутнасьцю ў 50.000 клвт., які працуе на Капырскай станцыі. Прыступлена да пабудовы турбін для Дняпрэбуду магутнасьцю ў 62.000 к. с. Ня толькі ў царскай Расіі, але пасьля Капырыцінскай рэвалюцыі, да 1925 г. турбін і гідрагенэратараў не будавалася. Выпушчана электрыфікаванае для магутнага блоку.

Электрафікаванае для механізацыі і электрыфікацыі вугальнай прамысловасьці (маторы для ўзрубных машын, для лябедак і інш.).

Сьвідравальныя маторы ў 30 кент. для нафтавай прамысловасьці.

Асінхронныя маторы (1.600 кв., 125 абаротаў) і матогенэратары (2,500 кв.) для прасочных варштатаў.

Трансфарматоры да 20.000 кент.

Масьленыя выключальнікі на напружаньне ў 115.000 вольт і на разрыўную магутнасьць у паўтары мільёна кілёвольт—ампер (ква).

У другім квартале 1931 году выпушчан падводны кабель на 120.000 вольт, а ў канцы 1931 году ўворы падводнага кабеля на 220.000 вольт (ціпер вышрабоўваецца) і вопытны канец голага кабеля на напружаньне 380.000 вольт. Найбольшае напружаньне падводнага кабелю, які знаходзіцца ў эксплёатацыі ў Германіі, дасягае толькі 100.000 вольт, а ў Амэрыцы — 132.000 вольт і выпрабоўваецца 220.000 вольт. Голы кабель у Эўропе і Амэрыцы ёсьць у эксплёатацыі на напружаньне 220.000 вольт.

Тое-ж самае, таварышы, на «Калтарурбіне». Калі ў 1913 г. выраблялася ў царскай Расіі 30 тыс. кв. мэтраў, у 1930 г.—138 тыс. кв. мэтр. і ў 1931 г. —207 тыс. кв. мэтр. Турбін за час ад 1907 па 1916 г. было выпушчана толькі 24 шт. агульнай магутнасьцю ў 8 тыс. клвт., у 1930 г. было выпушчана 283 тыс., у 1931 г.—753 тыс. Наладжана сарыйная вытворчасьць на металічным заводзе імя Сталіна 24-тысячных і 50-тысячных турбін. Справяхтавана цёпнафікацыйная турбіна ў 25 тыс. клвт., у 1932 г. будзе выпушчана 8 шт. Перайшлі на выраб каталёў 1.500 і 2.500 кв. мэтр.

Абсталяваньня для мэталюргіі, горнай прамысловасьці, вугалю, нафты, узбагачальнага абсталяваньня да 1930 г. амаль не выраблялася, у 1930 г. было выраблена на 10 млн., у 1931 г.—на 50 млн.

Упяршыню ў 1931 г. на Іжаўскім заводзе былі пабудаваны 2 блюмінгі. Пабудаваны ў нас 4 разьлівачных машыны, упяршыню пачат выраб крэкінгаў, трубчатак, узбагачальнага і розпага іншага абсталяваньня.

Пастаўлена зусім новая галіна, якой раней у нас амаль ня было,—гэта аўтатрактарнае машынабудаўніцтва. Трактараў мы выпусьцілі ў 1931 г. 40.000 шт., у 1930 г.—12.727. У конскіх сілах у 1931 г.—550 тыс. к. с., у 1930 г.—123 тыс. Аўтамашын у 1931 г. — 20.500 шт., у 1930 г.—8.500 шт.

Трэба было паставіць сваё варштатабудаўніцтва, бо бяз гэтага прышлося-бы ўвесь час вісець на імпартных варштатах. Гэта справа ў старой дарэвалюцыйнай Расіі была ў самым зачатачным стане.

У 1913 г. уся вытворчасьць варштатаў апанавалася ў 3,3 млн. руб. У 1928-29 г. выпушчана варштатаў на 8,5 млн. руб. У 1931 г. варштатная прадукцыя па ўсім Саюзе скалала 55 млн. руб., г. зн. перавысіла больш чым у 15 раз даваенную. Па ліку варштатаў выпуск 1931 г. складае 16 тыс. шт. супроць 7 тыс. у 1930 г. У 1931 г. выпусьцілі па Саюзе каля 40 маладзіц розных металярэжучых варштатаў.

У канцы 1931 г. скончыліся буйнейшыя работы на заводзе рэвальверных варштатаў у Маскве (коштам у 26,2 млн. руб., з выпускам пры двухзьменнай рабоце 6.200 рэвальверных варштатаў і поўаўтаматаў найбольш удасканаленых канструкцый) і на заводзе фрэзерных варштатаў у Ніжнім-Ноўгарадзе (коштам у 30 млн. руб. і з выпускам пры двухзьменных 12.500 фрэзерных варштатаў).

Два новых заводы каштуюць 56 млн. руб., а ўвесь дзейны ў 1931 г. асноўны капітал Варштатабудаўнішыня—26 млн. р., г. зн. за год асноўны капітал патройвацца, а таксама патройваецца і вытворчая магутнасьць 9 тыс. варштатаў у 1931 г. і 28 тыс. варштатаў разам з двума новымі заводамі.

З 1932 г. будуць пушчаны ў сэрыйную вытворчасьць да 15 новых маладзіц высокакваліфікаваных варштатаў сучасных канструкцый.

Тамім-жа тэмпамі ішла справа паставіць вырабу свайго інструменту. Гэта справа ў стары час таксама была паставлена ў мізэрных разьмерах.

Усяго выраблена інструменту:

у 1930 г. на 131 млн. руб.;

у 1931 г. на 171 млн. руб.

Рост на 30 проц.

Кваліфікаваны рэжучы і кантрольна-вымяральны інструмант (фрэза, розьба роду разьбёткі, мэтчыкі мэтрычныя, пліткі Іогансана, мікрамэтры і г. д.) да 1931 г. у Саюзе зусім не выраблялося, або выраблялося ў мізэрнай колькасьці.

На працягу 1931 году былі ўстаноўлены наступныя новыя вытворчасьці: пліткі Іогансана, разьбовыя мікрамэтры, разьбамэры, мэтрычныя мэтчыкі, наварныя сьвідры з хуткарэжучай сталі і розныя віды спэцыяльнага кантрольна-вымяральнага інструменту.

Выраб важнейшых відаў інструменту ў 1930 і 1931 г. у тыс. штук

	1930 г.	1931 г.	% у 1930 г.
Сьвідры	4300	9040	205
Мэтчыкі	461	800	175
Плашкі круглыя	121	250	207
Фрэза	39	44	113
Мікрамэтры	15	39	260
Разьбёткі	577	813	141
Штангелі	80	113	140
Кантрольна-вымяр.	40	88	220

Усіх гэтых кваліфікаваных відаў рэжучага і вымяральнага інструменту дана ў 1930 г. на 15,9 млн. руб., а ў 1931 г.—31,7 млн. руб., г. зн. рост на 100 проц. пры агульным росьце па ўсім інструмэнце на 30 проц.

У 1932 г. уводзяцца ў эксплёатацыю інструментальныя заводы «Фрэзэр» і «Калібр» вытворчай магутнасьцю на 110 млн. руб. інструменту. Такім чынам і тут мы стаміліся на свае ўласныя ногі.

Пачало разгортвацца хэмічнае машынабудаўніцтва. Пастаўлены новыя для Саюзу віды абсталяваньня: калаўбільнікі, вакуум - сушылкі, газолудзіры, цэнтрафугі і інш. На радзе буйных прадпрыемстваў хэмічнай прамысловасьці, якія будуюцца (Дарагамілаўскі, Чарнарэчанскі, Васкрасенскі, Бобрыкаўскі, Вярэзьнікаўскі камбінат) савецкае абсталяваньне займае вялікае месца.

Твар савецкага машынабудаўніцтва за гады пяцігодкі: асабліва за 1931 г., рэзка зьмяняецца. Калі ў 1930 г. новыя вытворчасьці, пастаўленыя ўпяршыню ў пяцігодкі, складалі толькі 9 проц., то ў 1931 г. яны ахапляюць больш 25 проц. усёй прадукцыі машынабудаўніцтва (1.211 млн. руб. з 4.730 млн. руб.). Як я ўжо сказаў, вялізарная частка з іх пастаўлена ў 1931 г.

Новыя машыны патрабавалі і адпаведнага метаду — якаснай сталі. У 1930 г. выраблена 65 тыс. т.; у 1931 г. —200 тыс. т. Вялікі скачок наварад металоргіі якаснай сталяй паявіна зрабіць у 1932 г. (660 тыс. т.).

Асвоен у вытворчасьці рад гатункаў якаснай і высокаякаснай сталі:

Хуткарэжучая сталь—«Электрасталь» у 1931 г. —3.2 тыс. тон. Хроманікелевая —«Электрасталь» у 1931 г.—амаль 5 тыс. тон.

Шарыкаподшыпнікавая — «Электрасталь» і Златаўстаўскі завод.

Аўтатрактарная сталь—«Серп і молот», «Красный Октябрь», «Красный путиловец», Марыўпальскі завод.

Аўтарэсорная—Златаўстаўскі.

Нержавеючая—Златаўстаўскі і Лысьвенскі, «Электрасталь», Ізгаёўскі.

Вугляродзістая інструментальная — Златаўстаўскі.

Дынамнае і трансфарматорнае жалезо—Верхісецкі завод у 1931 г.—24 тыс. тон.

Сталь Гатфільда—«Серп і молот» (для стрэлак, крестовін, частак для драг, зямлячарпалак, шчок для камнядробілак, разьлівачных машын).

Якасны дрот—«Серп і молот».

Фэрасплавы (фэрасіліцы, фэрахром) —Чэлябінскі завод фэрасплавоў: у 1931 г.—5 тыс. т., у 1932 г. — 16,5 тыс. тон.

Новыя кадры

Пабудова новых вытворчасьцяй і задачы асваеньня новай тэхнікі патрабуюць фундаментальнай падрыхтоўкі тэхнічных кадраў у адпаведных мерытодах.

Кадраў мы больш за ўсё бедныя. Труднасьці, якія перажывалі мы ў галіне асваеньня новай тэхнікі патрабуюць—гэта перш за ўсё з-за недахопу кадраў. Нам прыходзіцца стварыць кадры за ходу. Падрыхтоўка кадраў разгортваецца шырока. На 1 студзеня 1932 г. за ВТНУ, тэхнікумах і рабфаках у сыстэме ВСНГ навучалася 870 тыс. чалавек, у школах ФЗВ — 625 тыс. і на усіх іншых курсах—700-800 тыс. чалавек. Толькі ў сыстэме ВСНГ навучаецца звыш 1.800 тыс. чал.

У 1931 г. выпушчана 21 тыс. маладых інжынэраў і тэхнікаў, у 1932 г. будзе выпушчана 38 тыс., а ў 1933 г.—87 тыс. З школ ФЗВ у 1931 г. было выпушчана 51 тыс. чал., у 1932 г. будзе выпушчана 350 тыс. чал. Гэтыя новыя кадры, якія хутка растуць у сваёй колькасьці, загартоўваюцца ў барацьбе за аўладаньне новай тэхнікай, складаюць важнейшую ўмову для далейшага разгортваньня сацыялістычнай прамысловасьці.

Навукова-дасьледчыя ўстановы прамысловасьці вырасьлі за прайшоўшы год з 141 да 255 адзінак. Лік навуковых работнікаў вырас з 6 тыс. да 12,5 тыс. Сувязь навукова-дасьледчых устаноў з практычнымі задачамі прамысловасьці ўсё-ж надзвычай невыстарчальная, хаця ў 1931 г. зроблен значны крок наперад. Вельмі часта вялікая колькасьць нашых вучоных, тэхнікаў і інжынэраў сядзіць у навукова-дасьледчых інстытутах, робіць часта вельмі карысную работу, але трэба проста сказаць, што ад заводаў яны яшчэ далёкі. Некаторы паварот, нясумненна ёсьць, але ён невыстарчальны.

Адзін з прафэсароў, тав. Юшкевіч, на савеце хэмічнай прамысловасьці зусім правільна гаварыў, што «пара разурушыць манастырскія сьцены нашых інстытутаў і акружыць навуковых работнікаў у рэальнае жыцьцё». «З-за манастырскіх сьцен лябараторый і інстытутаў—на заводы,—вось што павінна стаць лёзунгам у рабоце навукова-дасьледчых інстытутаў у СССР»—гэты лёзунг прафэсара Юшкевіча сустрэў даволі моцныя супярэчаньні з боку некаторай часткі прафэсуры. Асобныя прафэсары ўказвалі на тое, што як-бы з пры чины гэтага навука не адстала. Праф. Юшкевіч мае рацыю: навука павінна з «манастырскіх» сьцен інстытутаў пайсьці на заводы і фабрыкі. Бо, калі навука апладніць сваёй работай нашы заводы і фабрыкі, яна дасьць вялікія результаты і сама ня толькі ня будзе адставаць, але яшчэ хутчэй пасунецца наперад.

Паляпшэньне становішча рабочай клясы

З ростам нашай прамысловасьці расьце і мацнее армія работнікаў сацыялістычнай прамысловасьці. Лік рабочых і служачых па трактарным інвентары, намечаны на ўсе 5 год, перавыконан за тры гады на 32 проц. За чатыры гады, уключаючы плян 1932 г., с.-г. машынабудаўніцтва дасьць прадукцыі на 1.970 млн. руб., а іх трактарнага інвентару—на 1.058 млн., г. зн. у 3 з пал.—4 разы больш, чым намечана ў агульнай суме за 5 год. Трактарны інвентар павінен быў паводле пяцігодкі скласьці ў 1932-33 г. 26 проц. усёй прадукцыі с.-г. машынабудаўніцтва. Фактычна трактарны інвентар складаў: у 1928-29 г.—4,4 проц. ад усёй прадукцыі с.-г. машынабудаўніцтва; у 1929-30 г.—21 проц., у 1931 годзе — 61 проц. і ў 1932 г.—76 проц.

Аджанікідзэ. Дрыўляныя дамы дрэнныя, але я думаю, калі гэтыя дрыўляныя дамы сабраць як належыць, даглядаць за імі як належыць, трымаць іх у чыстаце, дык гэтыя дрыўляныя дамы будуць даволі добрыя. Чаму гэта пад Масквой гэтыя дрыўляныя дамы добрыя, а ў Данбасе яны ператвараюцца ў дрэнныя. А вазьмеце, тав. Макар, ня толькі дрыўляныя дамы, але і якія хочаце дамы, калі за імі не прыглядаць, калі іх заносіць брудам, то ўсякія дамы будуць дрэннымі.

Макар. Калі будзе будаваць Стандартжылбуд, то дамы будуць брудным.

Арджанікідзэ. Бачыце, будуе Стандартжылбуд, а жыць застаецеся вы. Стандартжылбуд ня можа хадзіць за вамі і ўбіраць бруд у дамох, у якіх вы жывеце. Дамы прыходзіцца ўбіраць вам. І як я сам не нападаў на Стандартжылбуд, усё-ж трэба сказаць, што пры ўсіх недахопах яго работы яму ўдалося амаль што падвоіць жыллёвую ў Данбасе.

Мэнжэр. Трэба будзе паглядзець.

Арджанікідзэ. А ты глядзі і ўбірай.

Макар. Тав. Постышаў глядзеў.

Постышаў. Я глядзеў, але я-ж не гавару, што яны дрэнныя.

Разгортваючы цяжкую прамысловасьць—гэту аснову сацыялістычнай перабудовы нашай краіны,—мы за прайшоўшы перыяд часу зрабілі значны крок наперад і па лёгкай прамысловасьці. Хадзя тое, што мы маем у сучасны момант, значна вышэй даваеннага ўзроўня вырабу прадметаў шырокага спажываньня, але мы павінны разьвіцца не на ўчарайшы дзень, а на ўзрастаючыя патрэбы рабочай клясы сёньня.

(Гапасы. Правільна).

Калі ўзяць 1913 г., то аказваецца, ва ўсёй Расіі вырабліваецца галёш 27 млн. Мы ў 1931 г. выраблілі 53,9 млн., г. зн. амаль у два разы больш даваеннага, і ў два з чвэртакай разы больш, чым у 1925 г.

Абутку скуранога ў 1913 г. было выраблена 8.400 тыс. пар, у 1925 г. мы выраблілі 2 млн., у 1931 г.—76.800 тыс. г. зн. у дзевяць раз больш даваеннага і ў 9,5 раза больш 1925 г. Калі нават улічыць, што ў 1913 годзе было выраблена саматужнікамі яшчэ 8,5 млн. пар, дык і тады розьніца вялізарная. Але ўсё-ж такі нам сёньня 76,8 млн. пар мала. І зусім натуральна, што мала.

Мыла гаспадарчае. Колькі развязваньня было і застаецца з-за мыла. Ну, паглядзеце, калі ласка, мыла гаспадарчага ў 1913 годзе было выраблена 94 тыс. тон, у 1925 годзе—80 тыс. тон, у 1930 годзе—176 тыс. тон, у 1931 годзе —182 тыс. тон (сьмех). Амаль у два разы больш, чым у даваенны час. А ўсё-такі мала. (Гапасы: мала).

Прадукцыі бавоўняна - папяровай у 1913 годзе было 270 тыс. тон, у 1925 годзе—209 тыс. тон, у 1930 годзе—284 тыс. тон, у 1931 годзе—306 тыс. тон.

Што затрымлівае, таварышы, у нас далейшае фарсаванае разьвіцьцё лёгкай прамысловасьці? Сырэц. І тут мы да нашых прыняцеляў з Народнага Камісарыяту Земляробства можам таксама зьвярнуцца з патрабаваньнем. Яны вельмі энэргічна і вельмі правільна настойваюць на тым, калі яны хочуць атрымаць машыны, але, па-чэсному, прамысловасьць таксама мае права патрабаваць ад іх больш сырцу. (Гапасы. Правільна).

Нашы тэкстыльныя фабрыкі маюць магчымасьць пры рацыяналізацыі і лепшым дадатку машын перапрацаваць у год каля 40 млн. пудоў бавоўны. Мы-ж у сучасны момант перапрацоўваем, як вам вядома, ня больш 23-24 млн. пудоў.

Я прыбяў, таварышы, даныя аб росьце коньскасьці рабочай клясы, росьце заработнай платы нашых рабочых, росьце жыллёвага фонду рабочых, аб павялічэньні вырабу прадметаў шырокага спажываньня. Зазірнем цяпер на хвілінку, што робіцца ў крайнах капіталу.

У той час, як у СССР фонд заработнай платы па ўсёй краіне ўзрос з 10,5 млрд. руб. у 1929 годзе да 21 млрд. р. у 1931 годзе (рост на 100 проц.), лікавая дапавана беспрацоўе, лік рабочых і служачых узрос па ўсёй краіне на 6.200 тыс. чалавек,—за гэты-ж перыяд даходы асоб займовай працы ў ПАЗШ зьнізіліся з 45 млрд. даляраў у 1929 годзе да 28 млрд. даляраў у 1931 годзе. Паданьне на 37 проц. Да канца 1931 году ў Амэрыцы налічвалася 12 млн. беспрацоўных, або 30 проц. усіх асоб займовай працы і звыш таго вялізарная армія, працуючых 2-3 дні ў тыдзень, і рэзка зьнізана заработная плата ўсіх рабочых. А ва ўсёй Эўропе і ПАЗШ беспрацоўных ня менш 25 млн. чал.

Перамаганьне сэзоннасьці

Адным з стур'ёных дасягненьняў нашай прамысловасьці ў 1931 г. было перамаганьне таго штогоднага летняга зьніжэньня прадукцыі, якое мы мелі за працягу з 1924 па 1930 год. І калі вы прааналізуеце лічбы, дык вы ўбачыце, як штогод пал'ём у студзені, лютым і сакавіку зьмяняецца паляньнем, пачынаючы з красавіка, і новым пад'ёмам, пачынаючы са жніўня—верасьня. Гэта вы бачыце па ўсіх галох. Найбольш крутое паданьне вы бачыце ўлетку 1930 году.

У 1931 годзе летняга паданьня мы не дапусьцілі. Гэта тлумачыцца як ростам арганізаванасьці самой прамысловасьці, так і тэй вялізарнай работай, якая была праведзена ў гэты перыяд партыяй і яе Цэнтральным Камітэтам. Вялізарную ролю адыграл тут пэўныя ўстаўкі тав. Сталіна, даныя ім на чэрвеньскай нарадзе гаспадарнікаў.

Ад XIV зьезду да XVII партканфэрэнцыі

Таварышы, на IV кангрэсе Камінтэрну ў 1922 годзе Ленін сказаў:

«Вырабаваньнем для Расіі зьяўляецца ня толькі добры ўраджай у селяніскай гаспадарцы—гэтага яшчэ мала—і ня толькі добры стан лёгкай прамысловасьці, якая пастаўляе селяніству прадметы спажываньня,—гэтага таксама яшчэ мала,—нам неабходна таксама цяжкая індустрыя. А для таго, каб прыняцьці яе ў добры стан, патрабуецца пякт год работы.

Цяжкая індустрыя мае патрэбу ў дзяржаўных субсыдыях. Калі мы іх ня знойдзем, дык мы, як цывілізаваная дзяржава,—я ўжо не гавару, як сацыялістычная—загінулі. І так у гэтых адносінах мы зрабілі рашучы крок. Мы выбралі сродкі, неабходныя для таго, каб паставіць цяжкую індустрыю на ўласныя ногі. Сума, якую мы дасьтуль выбралі, праўда, ледзь правышае дваццаць мільёнаў залатых рублёў, але ва ўсякім выпадку гэтая сума ёсьць, і яна прызначаецца толькі для таго, каб узьвесьць вашу цяжкую індустрыю».*)

Становішча нашай цяжкай прамысловасьці ў сучасны момант ні ў якай меры не находзіць на тое, якое было ў 1922 г. Прамысловасьць за гэтыя гады гігантскі ўзрасла, умацавалася і пэўна плыве наперад. Але тым ня менш цытаньне аб цяжкай індустрыі, аб разьвіцьці нашай прамысловасьці застаецца ў такой жа ступені перпэндыкулярнай задачай, якой яе заўсёды лічыў Уладзімер Ільліч.

Выходзячы з гэтай кіруючай дырэктывы, тав. Сталін на XIV зьезьдзе нашай партыі, у барацьбе з трацкістска-апозыцыйскай апазыцыяй, так сфармуляваў нашу генэральную лінію:

«Перапрацыць нашу краіну з аграрнай у індустрыяльную, здольную вырабляць сваімі ўласнымі сіламі неабходнае абсталяваньне,—вось у чым сутнасьць, аснова нашай генэральнай лініі. Мы павінны паставіць справу так, каб помыслы і імкненьні гаспадарнікаў былі накіраваны ў гэты імянна бок, у бок пераўтварэньня нашай краіны з краіны, уносячай абсталяваньне, у краіну, вырабляючую гэта абсталяваньне. Бо ў гэтым асноўная гарантыя гаспадарчай самастойнасьці нашай краіны. Бо ў гэтым гарантыя таго, што наша краіна ня будзе ператворана ў прыдатак капіталістычных краін». (Заключнае слова тав. Сталіна на XIV зьезьдзе партыі (б). Сьнежань 1925 г.).

XIV зьезд партыі пастанавіў «Забясьпечыць за СССР эканамічную самастойнасьць, якая абараняе СССР ад пераўтварэньня яго ў прыдатак капіталістычнай сусьветнай гаспадаркі, для чаго трымаць курс на індустрыялізацыю краіны, разьвіцьцё вырабу ўзроўкаў вытворчасьці і стварэньне рэзэрваў для эканамічнага маневраваньня».

Як выконвецца, таварышы, гэтая дырэктыва зьезду, дадзая на аснове прастых указаньняў Уладзімера Ільліча?—Пасьля XIV зьезду партыі прайшло 6 год. Давядзіце мне прывесьці некалькі лічбаў, якія зьяўляюцца адказам на пастаўленае пытаньне.

ПРАДУКЦЫЯ Ў 1925 І Ў 1931 ГОДЗЕ
(важнейшыя віды ў натуры)

	1925 г.	1931 г.	Павялічэньне ў 1931 г. да 1925 г.
Каменны вугаль	17,6 млн. тн.	56 млн. тн.	Больш чым у 3 разы
Кокс	1,62 " "	6,75 " "	У 4 разы
Нафта (бяз газу)	7,2 " "	22,3 " "	" 3 "
Торф	2,5 " "	9,4 " "	Больш чым у 3,5 раз.
Чыгун	1,5 " "	4,9 " "	" " у 3,5 "
Сталь	2,1 " "	5,3 " "	У 2,5 раз
Пракат	1,6 " "	4,0 " "	" 2,5 "
Медзь	12 тыс. тн.	48,8 т. тн.	" 4 "
Медны калчадан	229 " "	1,084 т. тн.	Больш чым у 4,5 раз.
Пэмант	872 " "	3,344 " "	Каля 4 раз
Суперфасфат	67,8 " "	521,6 " "	Звыш 7,5 "
Гумавы абутак	19 млн. пар	54 млн. пар	" 2,5 "
Машынабудаўніцтва ў цэлым	730 млн. р.	5·724 млн. р.	Амаль у 8 раз
С.-г. машынабудаўніц.	48,6 " "	441 " "	У 9 раз
Электратэхніка	92,5 " "	980 " "	" 10 "
Варштаты	2,5 " "	40 " "	" 16 "
Выраб электраэнэргіі на ўсіх стан.	2925 млн. квт	10.600 м. квт.	Звыш 3 раз
У тым ліку на раённых станцыях	935 " "	6.450 " "	У 7 раз
Устаноўленая магутнасьць усіх электрастанцый (на канец году)	1.375 т. квт.	3.967 т. квт.	Амаль у 3 разы
У тым ліку на раён. станцыях	367 " "	2.287 " "	У 6 раз
Трактараў	469 шт.	41.280 шт.	
Аўтамашын	80 шт.	20.511 шт.	

Вось, таварышы, адказ на пытаньне, як выконваліся дырэктывы Уладзімера Ільліча і пастанова XIV зьезду партыі.

— Усямернае разгортваньне цяжкай прамысловасьці, як асноўная базы сацыялістычнага будаўніцтва чорнай і каляровай металоргіі, выраб электраэнэргіі аналу, машынабудаўніцтва, хэміі, стварэньне у бліжэйшы перыяд новай магутнай металоргічнай базы ў выглядзе Урала-Кузбескага камбінату»,—таказа пастанова XVI зьезду партыі.

Гэта было летам 1930 году.

Сёньня—Магнітная, Кузьнецкі завод, Уралмашбуд, завод фэрасплавоў у Чэлябінску, кузьнецкі вугаль, пачатак пабудовы Тагільскага металоргічнага заводу зьяўляюцца адказам на гэта рашэньне партыі.

Калі летам 1930 г. гэта было сьмелым рашэньнем зьезду бальшавікоў, дык сёньня гэтае рашэньне пераўтварэцца ў сапраўднасьць. Там, дзе года 1½—2 таму назад нічога літаральна ня было, сёньня пабудаваны вялізарнейшыя заводы.

Але гэтым не абмяжоўваецца гэты адказ. Пушчана першая чарга Боравіцкай, у Чалябінску будуецца трактарны завод, у Новасібірску будуецца завод камбайнаў, ва Уфе—маторны завод, у Сызрані—аўтамабільны завод, у Сібіры вырашана пабудаваць бавоўнавя-папяровы камбінат — усё гэта ўзводзіцца на новай Урала-Кузбескай базе.

Так выпадаліся, таварышы, у гэтыя гады пытаньні пабудовы сацыялізму ў нашай краіне.

Мы ўсе памятаем, што гэта прадугледзіла ня гладка. Для таго, каб адстаяць правільныя пазыцыі нашай партыі нам прышлося весьці бязьлітасную барацьбу супроць трацкістаў, зіноўевіцаў, правых. Без таго, каб у гэтай барацьбе адстаяць генэральную лінію нашай партыі, ленінскую лінію, гэтых посьпехаў мы-б ня мелі. Толькі дзякуючы таму, што ленінскі ЦК на працягу ўсіх гэтых год правільна кіраваў партыяй, толькі таму нам удалася гэтая перамога.

У гэтай вялізарнейшай барацьбе за ленінскую лінію партыі, за перамогу сацыялізму ў нашай краіне правадыром нашай партыі быў і застаецца тав. Сталін.

Асноўныя недахопы ў рабоце прамысловасьці ў 1931 г.

Гэткія, таварышы, асноўныя посьпехі нашай прамысловасьці ў 1931 годзе. Ня гледзячы, аднак, на гэтыя посьпехі, мы праграму недавыканалі.

Выканаўнае пляну 1931 г. азначала-б што прамысловасьць выконвае пяцігодку ў тры гады. Гэта не ўдалося. Гэта ўдалося толькі спасобным перадавым аддзелам нашай прамысловасьці.

Але мы-б мелі яшчэ большыя посьпехі, калі-б працавалі лепш.

Плян кольскага недавыканаў. Сабекошт замест зьніжэньня павысіўся, прадукцыйнасьць павялічылася значна.

Дзе-ж прычыны недавыкананьня пляну?

Першай прычынай, якая, пачынаючы з сьнежня, асабліва ў студзені і лютым, прыцягнула прамысловасьць і перадавала ёй разгортваць—гэта былі бязумоўна летапісныя транспартныя затруднэньні.

На прыведзенай ужо дыяграме вы бачыце, што ў 1930 г., па прыкладзе папярэдніх год, прамысловасьць дае летняе паданьне вытворчасьці, а са жніўня пачынаецца ўзьдым, і ў сьнежні прадукцыя дасягае 1.700 млн. руб. Замест далейшага росту ў студзені 1931 г. транспарт зьбівае гэтую крывую ўніз і ў лютым зьнізіўшы на ўзровень лютага попярэдняга году, як гэта паказана на дыяграме. Прамысловасьць спрацілла дасягнуты ў сьнежні ўзровень. Гэта быў удар, які даволі моцна расстроіў прамысловасьць. Больш таго, гэта прынесла яшчэ і тую шкоду, што ўсе сілы сталі сьцягвацца на транспарт. Усе свае ўнутраныя недахопы валілі на транспарт.

Транспартныя затруднэньні зьявіліся ў сучасны момант ні ў якай меры не находзіць на тое, якое было ў 1922 г. Прамысловасьць за гэтыя гады гігантскі ўзрасла, умацавалася і пэўна плыве наперад. Але тым ня менш цытаньне аб цяжкай індустрыі, аб разьвіцьці нашай прамысловасьці застаецца ў такой жа ступені перпэндыкулярнай задачай, якой яе заўсёды лічыў Уладзімер Ільліч.

Выходзячы з гэтай кіруючай дырэктывы, тав. Сталін на XIV зьезьдзе нашай партыі, у барацьбе з трацкістска-апозыцыйскай апазыцыяй, так сфармуляваў нашу генэральную лінію:

«Перапрацыць нашу краіну з аграрнай у індустрыяльную, здольную вырабляць сваімі ўласнымі сіламі неабходнае абсталяваньне,—вось у чым сутнасьць, аснова нашай генэральнай лініі. Мы павінны паставіць справу так, каб помыслы і імкненьні гаспадарнікаў былі накіраваны ў гэты імянна бок, у бок пераўтварэньня нашай краіны з краіны, уносячай абсталяваньне, у краіну, вырабляючую гэта абсталяваньне. Бо ў гэтым асноўная гарантыя гаспадарчай самастойнасьці нашай краіны. Бо ў гэтым гарантыя таго, што наша краіна ня будзе ператворана ў прыдатак капіталістычных краін». (Заключнае слова тав. Сталіна на XIV зьезьдзе партыі (б). Сьнежань 1925 г.).

XIV зьезд партыі пастанавіў «Забясьпечыць за СССР эканамічную самастойнасьць, якая абараняе СССР ад пераўтварэньня яго ў прыдатак капіталістычнай сусьветнай гаспадаркі, для чаго трымаць курс на індустрыялізацыю краіны, разьвіцьцё вырабу ўзроўкаў вытворчасьці і стварэньне рэзэрваў для эканамічнага маневраваньня».

Як выконвецца, таварышы, гэтая дырэктыва зьезду, дадзая на аснове прастых указаньняў Уладзімера Ільліча?—Пасьля XIV зьезду партыі прайшло 6 год. Давядзіце мне прывесьці некалькі лічбаў, якія зьяўляюцца адказам на пастаўленае пытаньне.

ПРАДУКЦЫЯ Ў 1925 І Ў 1931 ГОДЗЕ
(важнейшыя віды ў натуры)

	1925 г.	1931 г.	Павялічэньне ў 1931 г. да 1925 г.
Каменны вугаль	17,6 млн. тн.	56 млн. тн.	Больш ч

Ні аднаго калгасу і вёскі бяз сустрэчнага па загатоўках і вывазцы лесу!

ПАДХАПІЦЬ ВЫКЛІК КАЛГАСУ „ЯСНАЯ РАНІЦА“!

Адкрыты ліст

членаў калгасу „Ясная раніца“ да ўсіх калгасьнікаў і аднаасобнікаў—беднякоў і серадняко ў БССР

БАРЫСАЎ, 3/II.

Значэньне лясной прамысловасьці для сацыялістычнага будаўніцтва вызначае. Ад пасьпяховага выкананьня плянаў лесазагатовак залежыць:

— Бесьперабойнае снабжэньне лесаматар'ялямі гігантаў прамысловасьці — Магнітабуду, Кузьнецкбуду, Чалябінскага трактарнага і інш.

— Ход капітальнага будаўніцтва ў прамысловасьці, у сотнях збожжавых і жывёлагадоўчых саўгасаў і тысячах калгасаў.

— Умацаваньне капальняў Данбасу і іншых вугальных басэйнаў Саюзу.

— Пабудова новых дамоў для рабочых, абсталяваньне іх мэбляй.

— Выкананьне экспартных плянаў, павялічэньне запасаў валюты ў краіне.

— Забесьпячэньне гаралоў і прамысловасьці апалам.

Улічваючы ўсё гэта, мы, члены калгасу «Ясная раніца», пад кіраўніцтвам Кісена-Слабодзкага сельпартко ому, ударнымі тэмпамі працавалі ў лесе. Паводле дагавору з Барысаўскім леспрамгасам, мы павінны былі, у парадку самаабавязацельства, вывезьці ў першым кварталe 400 кбм. дроў і будаўнічай драўніны. Ня гледзячы на яспрыяючае надвор'е, на дрэнную дарогу, мы ў студзені вывезьлі 240 кбм., або 180 проц. месячнага заданьня і 60 проц. квартальнага. Нашы перамогі ёсьць—вынік сацспаборніцтва калгасьнікаў на лесазагатоўках, вынік правільнай расстаноўкі рабочай і цягавай сілы, правільнай арганізацыі і аплаты працы возчыкаў — калгасьнікаў.

Для ўдарнай работы па вывазцы намі вылучан спэцыяльны абоз у ліку 30 фурманак. Абоз разьбіт на тры брыгады, на чале са старшымі брыгадзірамі, якія адказваюць за ўсю работу. Коні, сані і ўся іншая збруя замацаваны за кожным членам брыгады. Кожная брыгада мае свайго конюха, які лічыцца яе роўнапраўным членам і нясе адказнасьць за правільны і добры нагляд за коньмі пасьля работы. Возчыкі-калгасьнікі атрымліваюць аплату за вывазку непасрэдна ад леспрамгасу і самі робяць адлічэньні на карысьць калгасу, паводле ўстаноўленых правіл.

Каб поўнасьцю выканаць заданьне першага кварталу, нам застаецца яшчэ вывезьці 160 куб. мэтраў. Улічваючы ўсю важнасьць сваячасовага выкананьня плану лесазагатовак для пасьпяховага будаўніцтва сацыялізму ў чацьвертым, заключным годзе, мы высоўваем сустрэчны план вывазкі ў колькасьці 1.100 куб. м., які абавязуемся ажыцьцявіць на працягу апошніх двух месяцаў першага кварталу.

Расказваючы ў гэтым лісьце аб нашых перамогах на лясным фронце, мы зварачаемся да ўсіх калгасьнікаў і аднаасобнікаў-беднякоў і серадняко ў з заклікам выкарыстаць вопыт нашай работы, каб на працягу лютага і сакавіка ня толькі скончыць выкананьне квартальнага пляну, але і вывезьці ня менш 50 проц. заданьня другога кварталу.

Наш лёзунг: — «НІ АДНАГО КАЛГАСУ І ВЕСКІ БЯЗ СУСТРЭЧНАГА ПЛЯНУ ПА ВЫВАЗЦЫ ДРОЎ І ЛЕСУ».

Мы запаўняем партыйныя, савецкія калгасныя арганізацыі, што наш сустрэчны план будзе поўнасьцю выкананы. Мы дамо руйнуючы адпор усякім спробам клясавага ворага і яго агентаў — апартуністаў перашкодзіць пасьпяховаму ажыцьцяўленьню заданьня, спробам замарозіць бальшавіцкія тэмпы лясных работ.

Мы спадзяемся, што сьледуючы нашаму прыкладу, усе калгасьнікі і аднаасобнікі—беднякі і серадняк БССР напружаць усе сілы, каб вывезьці загатоўлены лес, каб ні аднаго бервяна не пакінуць у лесе, каб з посьпехам завяршыць план загатовак гэтага году.

Па даручэньні сходу калгасьнікаў:

Старшыня калгасу ЯКАЎ ШАРХАЙ.
Члены праўленьня: БАЗЫЛЬ ПЯТРЫШЧАНКА, ЛАЎРЭН САКАЛОЎСКІ, МІКОЛА САМЦОЎ, ЯЎХІМ САФОНЧЫК, АДАР'Я КУЧЫНСКАЯ і МІКОЛА ГВАЗДОВІЧ.
Брыгадзіры: Ф. ГВАЗДОВІЧ, М. САМЦОЎ і М. САФОНЧЫК.

Загатоўка лесу ў Рэчыцкім раёне

МАГІЛЕЎСКІ ЛЕСПРАМГАС ТАРМОЗІЦЬ РАБОТЫ У ЛЕСЕ

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Плян загатовак лесаматар'ялаў 1931 г выканан па Магілеўскім раёне са значным перавышэньнем. Выкананьню пляну дапамагалі рабочыя брыгады, якія на працягу восені працавалі ў лесе. Аднак, зусім дрэнна стаіць справа з лесавывазкай. Плян чацьвертага кварталу мінулага году выканан на 22,1 проц., студзеньскае заданьне па вывазцы будаўнічага матар'ялу выканана на 7 проц., па дровах—на 12 проц.

У чым прычына зрыву вывазкі?

Яна карэніцца ў няўменьні і нежаданьні магілеўскага леспрамгасу перабудаваць работу па-новаму, у бязьдзейнасьці апэрацыйнага апарату. Чатыры вучастковыя прарабы нічога не зрабілі для правядзеньня масавай растлумачальнай работы сярод калгаснага сялянства. Замест баявой мабілізацыі калгасных мас і беднякоў і серадняко ў —аднаасобнікаў на ўзмоцненую вывазку лесу, работнікі леспрамгасу і паасобных сельсаветаў заняліся апартуністычнымі разважаньнямі: «Няма сапей, коні слабыя».

Шэсьць умоў тав. Сталіна не рэалізуюцца на лясных вучастках. Дагавораў з калгасамі заключана толькі 25 проц. патрэбнай колькасьці.

Кіраўнік леспрамгасу тав. Ліўшыц дагэтуль не дагаварыўся з райкалгассаюзам аб сумесным рабоце па заключэньні дагавораў

Разважаньні аб адсутнасьці сапей ня маюць пад сабой ніякіх падстаў. У адным леспрамгасе ёсьць звыш 600 сапей. На дварэ Белсельснабу таксама валяюцца каля 100 новых сапей, якія гніюць пад сьнегам. Між тым, ні райкалгассаюз, ні леспрамгас нічога не зрабілі, каб прасунуць сані ў калгасы і вёскі.

ПРАХАРЭНКА.

Першы дзень генэральнай праверкі

Заданьні трэцяй бальшавіцкай вясны

давесьці да кожнай брыгады і калгасьніка

„Ударнік Койданаўшчыны“ арганізуе масы на барацьбу за павышэньне ўраджайнасьці

За дэкаднік праверкі зьняць тормазы на шляху да пасеўнай

5 лютага пачынаецца ўсебеларускі рэйд праверкі падрыхтаванасьці саўгасаў, калгасаў і МТС да трэцяй бальшавіцкай вясны. Рэйд павінен мабілізаваць усю грамадзкасьць вёскі, масы калгасьнікаў і рабочых саўгасаў, раённы і нізавы друк на фарсаваньне тэмпаў падрыхтоўкі да сяўбы.

3 лютага пры ЦКК-НК РСІ адбылося пасяджэньне цэнтральнага штабу па правядзеньні рэйду. Была заслухана справаздача Койданаўскай райКК-РСІ і раённай газэты «Ударнік Койданаўшчыны» аб праробленай імі рабоце ў галіне падрыхтоўкі да рэйду.

Становішча з падрыхтоўкай да сяўбы ў Койданаўскім раёне нездавальняючае. Для засеву яравога кліну патрэбна мець 52.000 цэнт. насеньня. Пакуль створан насовы фонд у разьмеры 28.000 цэнт. Асабліва не хапае насеньня кармовых траў. Мясцовыя работнікі спадзяюцца на завоз насеньня траў і мала робяць для мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў.

Пасеўныя пляны дасланы ў сельсаветы 20 студзеня. Але да паасобных калгасных брыгад, да масы калгасьнікаў яны яшчэ не даведзены

Ня гледзячы на тое, што ў райвё ёсьць выстарчальная колькасьць збожжажачышчальных машын, з 47.000 цэнт. насеньня ачышчана толькі 4.000 цэнт.; машыны не нагружаны. Да апошняга часу ня было ніякага кантролю за ачысткай насеньня.

Рамонт трактараў разгортваецца вельмі марудна. З 46 трактараў адрамантавана толькі 17. МТС яшчэ не пераключылася па-баявому на падрыхтоўку да сяўбы. У рамонтнай майстэрні работа яшчэ не пераведзена па вызьдзельнічыну. Мала зроблена МТС і ў галіне падрыхтоўкі кадраў. У калгасах ня было праведзена папярэдняй масава-растлумачальнай работы аб накіраваньні на курсы па падрыхтоўцы кадраў лепшых калгасьнікаў-ударнікаў. У выніку курсы сьвінароў і трактарыстаў поўнасьцю не ўкамплектаваны.

РайКК уключылася ў рэйд праверкі падрыхтаванасьці да сяўбы з 20 мінулага месяца. Арганізован раённы штаб; зараз арганізавана 8 праверачных брыгад у сельсаветах і 5 — па мястэчку. У сельсаветы на дапамогу калгасам па ініцыятыве райКК выехалі дэлегаты настаўніцкай канфэрэнцыі і слухачы рахункаводных курсаў.

Добрым прыкладам падрыхтаванасьці да правядзеньня рэйду можа служыць Койданаўская газэта «Ударнік Койданаўшчыны». Газэта з 20 студзеня сыстэматычна вядзе падрыхтоўку да рэйду. У трох сельпарткомах рэдакцыя правяла вырокія масавыя сходы калгаснага актыву, на якіх падрабязна абгаворваліся пытаньні падрыхтоўкі да сяўбы і правядзеньня рэйду. У радзе саўгасаў наладжан рэгулярны выпуск пасьценных газэт, якія за апошні час зусім ня выходзілі.

У 4-х сельсаветах рэдакцыя правяла праверку падрыхтаванасьці да сяўбы. У выніку праверкі выяўлена, што Рубіжаўскі сельсавет канчае падрыхтоўку да вясны і высунуў сустрэчны плян. Па ініцыятыве рэдакцыі Рубіжаўскі сельсавет бярэ на буксір адстаючыя сельсаветы. У бліжэйшыя дні рэдакцыя пачынае масавы агрэпаход за ўкараненьне агратэхнікі, узьняцьцё ўраджайнасьці і пераключку калгасаў аб іх падрыхтаванасьці да сяўбы.

Далей штаб заслухаў інфармацыю цэнтральных менскіх газэт і Наркамзему аб іх мерапрыемствах па правядзеньні рэйду.

Рад таварышоў, якія выступалі ў спрэчках, падкрэсьлілі, што кіно і рацыі і прапаганды—яшчэ не пераключылі і прапаганды яшчэ не пераключыліся па падрыхтоўку да трэцяй бальшавіцкай вясны. Нездавальняюча і становішча з выданьнем масавай агратэхнічнай літаратуры. Стварэецца пагроза, што гэта літаратура, якая так патрэбна зараз выйдзе з друку са значным спазьненьнем калі ня будуць ўжыты адпаведныя меры.

***

8 лютага адбудзецца наступнае пасяджэньне штабу, на якім будуць заслуханы справаздачы Калгасцэнтру, Трактарацэнтру і саўгастрэстаў аб іх удзеле ў правядзеньні рэйду.

Ня толькі пашыраць пасеўную плошчу, але змагацца і за якасныя паказальнікі

ПЛЕШЧАНІЦЫ.

Рад калгасаў Плешчаніцкага раёну на-баявому рыхтуецца да сустрэчы веснавой сяўбы. Калгас «Барацьбіт за калектывізацыю» ўжо цяпер у поўнай гатоўнасьці спаткаць трэцюю калгасную. Дзякуючы распрацоўцы 6 умоў тав. Сталіна, усе віды работы ў калгасе пераведзены на вызьдзельчыну, ліквідавана абязьлічка. Калгасьнікі разьбіты на брыгады, да кожнай з іх прымацаваны коні з адпаведнай збруяй і інвэнтаром.

Калгас падрыхтаваў усю збрую, як калёсы, хамуты, лейцы і г. д.

Калгасы «Чырвоная Ніва» і «Зара Саветаў», Запольскага сельсавету, дзякуючы разгорнутай масава-растлумачальнай рабоце вакол пастановы ЦК ВКП(б) і СНК БССР аб веснавой пасеўнай кампаніі і пры абгаворэньні пляну веснавой сяўбы высунулі сустрэчныя пляны для пашырэньня яравога кліну. Калгас «Зара Саветаў» высунуў сустрэчны плян папырыць пасеўную плошчу ў 6 гэкт., «Чырвоная Ніва»—23 гэкт.

Але па вялікі жаль гэтыя калгасы не прынялі яшчэ пакуль мер да павышэньня ўраджайнасьці і не паставілі сабе канкрэтна задачай пры абгаворэньні пляну дабіцца максымальнага ўраджаю на сваіх калгасных палёх.

1.500 лепшых калгасьнікаў—на дапамогу слабейшым калгасам

Для поўнага забесьпячэньня падрыхтоўчай работы да веснавой пасеўнай кампаніі ў калгасах, праўленьне Белкалгасцэнтру паставіла мабілізаваць 50 проц. работнікаў апарату Калгасцэнтру для пасылкі ў раёны.

Для дапамогі слабейшым калгасам у правядзеньні падрыхтоўкі да пасеўнай кампаніі правесьці ў раёнах перакідку 1.500 вопытных арганізатараў з моцных калгасаў у слабейшыя (тэрмін з 10 лютага па 10 сакавіка).

„Ні аднаго цэнтнэра збожжа—прыватніку“ (ЦК УсеКП(б)

11,7 проц. гадавога пляну збожжазагатовак давыканаць у бліжэйшыя дні

5 лютага

Прайшоў студзень. За гэты месяц плян збожжазагатовак павінен быў быць поўнасьцю выкананы. Такая была дырэктыва партыі і ўраду.

Аднак, прыходзіцца канстатаваць, што выніку студзеня зусім нездавальняючыя. Калі на 1 студзеня гадавы плян збожжазагатовак па рэспубліцы быў выкананы на 77,8 проц., дык на 1 лютага, паводле даных Наркамснабу, мы маем толькі 88,3 проц. пляну. Такім чынам, за цэлы месяц прырост складае ўсяго 10,5 проц.

Гэтыя лічбы сьведчаць, што большасьць адстаючых раёнаў БССР не разгарнула ўдарных тэмпаў загатовак, не мабілізавала масы калгасьнікаў і аднаасобнікаў—беднякоў і серадняко ў на пасьпяховае завяршэньне кампаніі да XVII Усесаюзнай партканфэрэнцыі. Да такіх раёнаў можна аднесьці, напрыклад, Старадарожскі, Жлобінскі, Чавускі, Прапойскі, Клічаўскі і інш.

Гэтыя раёны не падхапілі вопыту перадавых, якія паказалі ўзор сапраўды бальшавіцкай барацьбы за збожжа і ня толькі выканалі, але і значна перавыканалі гадавыя пляны (Уваравічы, Гарадок, Сяньно, Сураж і інш.).

Сацыялістычны сэктар рэспублікі перавыканаў збожжазагатоўчы плян: калгасы—на 108,1 проц., саўгасы—на 101,7 проц. Тармозіць выкананьне агульнарэспубліканскага пляну аднаасобны сэктар. На 1 лютага па гэтым сэктары загатоўлена толькі 77 проц. пляну. Слабая масава-палітычная работа, а месцамі поўная адсутнасьць яе сярод беднякоў і серадняко ў—аднаасобнікаў, правыя і «левыя» скрыўленьні палітычні партыі, якія маюць месца ў некаторых мясцох — вось прычыны адставаньня аднаасобнага сэктару, слабага выканаьня бядняцка-серадняцкімі гаспадаркамі ў некаторых раёнах кантрактацыйных дагавораў і самаабавязацельстваў. Даволі ўказаць, што на 1 лютага па кантрактацыі ад аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак паступіла ўсяго ... 28 проц. пляну.

Зусім дрэнна спаганяюцца цьвёрдыя заданьні з кулацка-заможных гаспадарак. Слабы націск на кулака, а месцамі адкрытае патураньне яму прыводзяць у асобных раёнах да кулацкага сабатажу збожжазагатовак, да зрыву цьвёрдых заданьняў.

Баявая задача ўсіх партарганізацый і асабліва адстаючых раёнаў—неадкладна дабіцца максымальнага ўзмацненьня тэмпаў збожжазагатовак з тым, каб з посьпехам завяршыць кампанію ў бліжэйшыя-ж дні. 11,7 проц. гадавога пляну, якія яшчэ засталося выканаць, павінны быць рэалізаваны.

Аднаасобны сэктар—на буксір

ПАРЫЧЫ.

КАЛГАС «НОВАЕ ЖЫЦЬЦЁ», СЬЦЯПСКОГА СЕЛЬСАВЕТУ, ІДЗЕ Ў АВАНГАРДЗЕ ПА ЎСІХ ГАСПАДАРЧА-ПАЛІТЫЧНЫХ КАМПАНІЯХ І, У ПРЫВАТНАСЬЦІ, ПА ЗАГАТОЎКАХ. ВОСЬ ЛІЧБЫ, ЯКІЯ ГАВОРАЦЬ САМІ ЗА СЯБЕ:

ПЛЯН ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК ВЫКАНАН НА 118 ПРОЦ., БУЛЬБАЗАГАТОВАК—НА 158 ПРОЦ. ПЛЯН ЗДАЧЫ ІЛЬНАВАЛАКНА РЭАЛІЗОВАН УЖО НА 100 ПРОЦ., ІЛЬНАСЕМЯ—НА 112 ПРОЦ. ПА ЗДАЧЫ ДЗЯРЖАВЕ ПЛОДАГАРОДНІНЫ ПЛЯН ВЫКАНАН НА 159 ПРОЦ. УСЯГО КАЛГАС ПРАДАЎ ДЗЯРЖАВЕ КАЛЯ 3.000 ТОН ПРАДУКТАЎ НА 53.230 РУБ.

У ПАДАРУНАК XIV ЗЬЕЗДУ КП(б)Б КАЛГАС ЗДАЎ 8 АДКОРМЛЕНЫХ СЬВІНЕЙ І АДНУ ТОНУ ЗБОЖЖА ЗВЫШ ПЛЯНУ. КАЛГАС УЗЯЎ НА БУКСІР АДНААСОБНІКАЎ—БЕДНЯКОЎ І СЕРАДНЯКОЎ ВЁСКІ, СЬЦЯПЫ.

Г. М.

Рэалізаваць самаабавязацельствы

СМАЛЯВІЧЫ.

У адказ на адозву ўваравіцкіх калгасьнікаў і аднаасобнікаў Смалявіцкі раён прыняў самаабавязацельства — завяршыць збожжазагатоўкі да XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі. Аднак, самаабавязацельства выконваецца вельмі дрэнна. На 25 студзеня гадавы плян збожжазагатовак па раёне выканан толькі на 84,4 проц. За пэлую дэкаду (з 15 да 25 студзеня) прырост складае толькі 5.8 проц.

У Юраўскім, Забалоцкім, Кляніцкім і Прылейскім сельсаветах не аддаецца ўвага загатоўкам па аднаасобным сэктарам і зусім слаба спаганяюцца цьвёрдыя заданьні з кулацка-заможных гаспадарак. Кляніцкі сельсавет на 25 студзеня спагнаў цьвёрдыя заданьні на... 16,8 проц., Прылейскі — на 42,6 проц. За апошнія дзьве дэкады з кулакоў не паступіла ніводнага цэнтнэра збожжа.

У сярэднім па раёне цьвёрдыя заданьні спагнаны на 74,5 проц. у той час, калі ўсе тэрміны даўно прайшлі.

У радзе калгасаў дагэтуль яшчэ ня вытручаны кулацка-спажывецкія тэндэнцыі. Калгас «Герой працы» замест 115 цэнтнэраў, вызначаных пляном, здаў толькі 45 цэнтнэраў. Праўленьне катэгарычна адмаўляецца поўнасьцю выканаць плян, імкнучыся забясьпечыць у першую чаргу свае рэалкія патрэбы. Такія-ж факты маюць месца і ў калгасе «Чырвоная крыніца» і інш.

Старшыня калгасу «Першамайскі» тав. Барановіч, ён-жа сакратар Жалэлкаўскай парт'ячэйкі, увесь час ігнараваў здачу збожжа дзяржаве, разважаючы аб «нерэальнасьці» заданьня. Аднак, потым праўленьне калгасу здало лішкі збожжа дзяржаве, поўнасьцю выканаўшы заданьне. Такім чынам, выявілася, беспадстаўнасьць апартуністычных разважаньняў старшыні калгасу.

Калгас «Чырвоны Кастрычнік» (Верхменскі сельсавет) неадаў дзяржаве 58 цэнтн. збожжа. Кіраўнікі калгасу заяўляюць: «калі адзіно збожжа дзяржаве, дык ня будзе чым карміць сьвіней» (!!).

Усе гэтыя тэндэнцыі ігнараваць збожжазагатоўкі не сустракаюць рашучага адпору з боку мясцовых арганізацый.

Неабходна максымальна фарсаваць тэмпы здачы збожжа як у калгасах, так і па аднаасобным сэктары. Трэба рашуча націснуць на кулацка-заможныя элементы, прымусіць іх поўнасьцю і неадкладна выканаць цьвёрдыя заданьні. Смалявіцкі раён павінен рэалізаваць узятыя на сябе самаабавязацельствы—поўнасьцю выканаць гадавы плян збожжазагатовак у бліжэйшыя-ж дні.

ВЕРБІН.

Да канца рамонтнай засталіся лічаныя дні

НА 1 ЛЮТАГА АДРАМАНТАВАНА ТОЛЬКІ 19 ПРОЦ. ТРАКТАРАЎ

ЗВОДКА

аб ходзе рамонту трактараў па Трактарацэнтры і саўгасным сыстэмах на 30 студзеня 1932 г.

	НАЗВА СЫСТЭМЫ	ТРАКТАРЫ		
		Падлягаюць рамонту	Адрамантавана	Процант выкананьня
1.	Трактарацэнтр	1.115	202	18,1
2.	Сьвінаводтрэст	179	14	7,8
3.	Малекапрамтрэст	173	50	28,9
4.	Ільнаканапляводтрэст	118	39	33,1
5.	Насеннаводтрэст	84	22	26,2
6.	Садагародтрэст	49	5	10,2
7.	Лугтрэст	44	3	6,8
8.	Гародмалакоаб'яд.	26	—	—
9.	Сьвінаводаб'яд.	1	1	100
10.	Птушкатрэст	5	5	100
	РАЗАМ ПА БССР:	1.794	341	19 проц.

5 раёнаў, якія зрываюць рамонт трактараў

ВІЦЕБСК.

Ня гледзячы на тое, што пасьля вызначанага Наркамземам тэрміну (10 сьнежня) скавчэньня заключэньня дагавораў па рамонт трактараў прайшло больш месяца, сельска-гаспадарчыя арганізацыі, прымацаваныя да заводу «Камінтэрн», ня толькі не дасылалі свае трактары, але нават ня імкнуцца паклапаціцца аб заключэньні дагавораў на рамонт.

З прымацаваных да заводу «Камінтэрн» калгасаў і саўгасаў Бешанковіцкага, Лёзьнянскага, Сіроцінскага, Віцебскага, Гарадоцкага і інш. раёнаў толькі калгас «Лясковічы», Сіроцінскага раёну, 19 студзеня дасłаў заводу «Камінтэрн» два трактары, якія патрэбуюць рамонту.

Племгас «Крынкі» ўжо паўтара месяца як заключыў з заводам дагавор на рамонт аднаго трактару, але да гэтага часу трактар на завод яшчэ не дасланы. Не дасылае рамантаваць свой трактар і калгас імя Сталіна, Машканскага сельсавету.

Ня маючы на руках дагавораў і ня ведаючы колькасьць трактараў, якія патрабуюць рамонту, завод ня можа правільна разставіць рабочую сілу і весьці належную падрыхтоўку да рамонту трактараў. Трэба, нарэшце, пакончыць з бязьдзейнасьцю калгасаэмельных арганізацый вышэй адзначаных раёнаў. Трактары павінны быць неадкладна адгружаны заводу «Камінтэрн» для своечасовага правядзеньня рамонту.

Самуцін, Зарубежны.

ПАВЫСІЦЬ УДЗЕЛЬНУЮ ВАГУ СЬВІНЕЙ У ЗАГАТОЎКАХ ЖЫВЁЛЫ

Жывёлазагатоўкам—ударныя тэмпы

На 1 лютага квартальны плян загатовак жывёлы па БССР выканан на 12,8 проц., з іх па буйнай рагатай жывёле на 17,5 проц., сьвіньнях—на 5,2 проц., авечках—на 20 проц. Калгасы здалі буйнай рагатай жывёлы—19,3 проц., сьвіней—7,9 проц. Калгасьнікі з неаграмадзканым станам і аднаасобнікі выканалі плян па буйнай рагатай жывёле на 16 проц., сьвіньнях—5 проц.

Гэтыя лічбы гаворяць аб выключна марудных тэмпах жывёлазагатовак па ўсіх сэктарох і раёнах і недадзенцы некаторымі раёнымі і сельскімі арганізацыямі значэньня сваячасовага выкананьня пляну для бесьперабойнага забесьпячэньня мясам пралетарскіх цэнтраў. Па Прапойскім, Старадарожскім, Рэчыцкім раёнах заданьне не рэалізавана нават на 1 проц.

Пляны загатовак спушчаны па сельсаветах з вялікім спазьненьнем—у сьнежні і першай палове студзеня. Па асобных сельсаветах Рэчыцкага, Старадарожскага, Чырвонаслабодзкага, Бялынічскага, Чачэрскага і Чавускага раёнаў пляны загатовак да гэтага часу не даведзены да вёсак.

Камісіі садзейнасьці жывёлазагатоўкам пры сельсаветах бязьдзейнічаюць.

Зусім недапушчальным трэба прызнаць ход загатовак сьвіней. Загатоўкі, галоўным чынам, за лік буйнай рагатай жывёлы супярэчаць дырэктывам партыі і ўраду і падрываюць разьвіцьцё сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Яшчэ горш стаіць справа з афарбленьнем дагавораў на калектыўную гадоўлю і калектыўную здачу (продаж) дзяржаве сьвіней неспецыялізаванымі калгасамі і сельскагаспадарчымі прыстанямі.

Жывёлазагатоўкі—адказная гаспадарча-палітычная кампанія. Партыя і ўрад далі наконт гэтага канкрэтныя дырэктывы. Раённыя арганізацыі павінны дабіцца карэннага пералому ў ходзе кампаніі. Трэба неадкладна арганізаваць праверку давядзеньня плянаў да кожнага сельсавету, населішча, калгасу, таварнай фэрмы, кулацка-заможнай гаспадарцы.

Трэба павесьці рашучую барацьбу з кулацкімі спажывецкімі тэндэнцыямі ў асобных калгасах, з буржуазна-рвацкімі тэндэнцыямі ў радзе саўгасаў у выкананьні пляну загатовак жывёлы.

Неабходна рэзка ўзьняць удзельную вагу сьвіньні ў загатоўках. Кантрактацыя жывёлы павінна быць пераведзена на ўдарныя тэмпы.

Узмацніць націск на кулака

МАГІЛЕЎ.

У чацьвертым квартале Цішаўскі сельсавет, Магілеўскага раёну, ня выканаў пляну жывёлазагатовак. Сельсавет і парт'ячэйка ўлічылі недахопы мінулага году і правялі рад мерапрыемстваў па фарсаваньні загатовак у першым квартале бягучага году. Пляны дэтальна абмеркаваны на прэзыдыуме сельсавету і даведзены да паасобных калгасаў і паселішчаў. Некаторыя калгасы, як імя Сталіна і XIII гадавіны Чырвонай арміі, з посьпехам выканалі студзеньскі плян. Калгас імя Сталіна па здачы сьвіней выканаў заданьне на 111 проц.

Слаба праходзіць спагнаньне цьвёрдых заданьняў. Хоць пляны і даведзены да кулацка-заможных гаспадарак, але няма належнага націску.

Цішаўскі сельсавет мае ўсе магчымасьці поўнасьцю выканаць квартальны плян. Неабходна больш націснуць на кулака, узмацніўшы палітычна-масавую работу сярод аднаасобнікаў — беднякоў і серадняко ў.

С. Н.

У Лепелі абвешчан дэкаднік штурму

ЛЕПЕЛЬ.

Заданьне па жывёлазагатоўках выканана па раёне на 17,2 проц. Яшчэ ніжэй процант выкананьня пляну загатовак сьвіней. Такія тэмпы загатовак ставяць пад пагрозу рэалізацыю пляну.

Загатоўчыя арганізацыі, рад сельсаветаў не мабілізавалі грамадзкасьці вакол выкананьня пляну, не разгарнулі барацьбы з кулацка-рвацкімі настроямі ў паасобных калгасах.

Для ўзмацненьня тэмпаў жывёлазагатовак райвыканкам абвясьціў дэкаднік штурму. На працягу дэкадніка загатоўчыя арганізацыі абавязаны мабілізаваць усе сілы, накіраваць у сельсаветы, дзе разам з партыйнымі і камсамольскімі ячэйкамі, актывам сельспажыўтаварыстваў — арганізаваць масавую здачу таварнай прадукцыі калгасамі і аднаасобнікамі.

Сельсаветам прапанавана на працягу трох дзён спагнаць таварную прадукцыю па цьвёрдых заданьнях з кулацка - заможных гаспадарак. Адначасова павінна быць узмоцнена работа на ўкамплектаваньні сьвінагадоўчых і малочных таварных фэрм.

Дэкаднік павінен таксама даць значны рух у арганізацыі адкорму сьвіней унутры калгасаў, пры сельспажыўтаварыствах і сталоўках.

Л. Б.

2 проц. пляну

РАГАЧОЎ.

Па Рагачоўскім раёне плян жывёлазагатовак за студзень выканан на... 2 проц. Многія сельсаветы недаацэньваюць таго, якое значэньне мае выкананьне пляну поўнасьцю і ў тэрмін і не разгарнулі ў гэтай галіне належнай работы.

Такія сельсаветы, як Асаўніцкі, Вішанскі, Крупышаўскі, Мяркулавіцкі і Прыбоўскі не здалі ніводнага процанту пляну. 4 сельсаветы выканалі плян ад 0,5 проц. да 0,2 проц.

Анартуністычны самацёк, нежаданьне па-бальшавіцку ўзяцца за правядзеньне кампаніі — вось галоўныя прычыны адставаньня.

Задача раённых арганізацый і сельсаветаў — у бліжэйшыя дні крута ўзьняць тэмпы жывёлазагатовак, разгарнуўшы вакол іх масава-растлумачальную работу.

За бальшавіцкае адзінства ўсіх нацыянальных атрадаў пралетарскай культуры

У канцы студзеня Савецкую Беларусь наведала інтэрнацыянальная дэлегацыя пісьменьнікаў—прадстаўнікоў ад розных нацыянальных рэспублік Савецкага Саюзу. Сумесна з БелАПП'ам дэлегацыя правяла значную работу як у Менску, так і ў паасобных раёнах БССР.

Перад ад'ездам інтэрнацыянальная дэлегацыя пакінула ў «Зьвязьдзе» наступны калектыўны ліст.

***

Інтэрнацыянальная дэлегацыя пісьменьнікаў, вылучаная ўсесаюзнай канфэрэнцыяй драматургаў, кампазытараў, сцэнарыстаў і аўтараў малых форм, пазнаёміўшыся з гаспадарча-культурным сацыялістычным будаўніцтвам Савецкай Беларусі і завязаўшы брацкія сувязі з пралетарскім атрадам беларускага мастацтва, пераконана, што наладжаная сувязь з кожным днём будзе ўзмацняцца на аснове ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі, на аснове бальшавіцкага адзінства нацыянальных пралетарскіх культур усіх народаў СССР.

У Савецкай Беларусі — набываны гаспадарча-культурны расквіт, пасьпяховае выкананьне пяцігодкі, перамогі на ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва. А там, за рубяжом—гаспадарча - культурнае дзікае падзяволеньне Заходняй Беларусі польскім фашызмам, зьбяднеьне працоўных мас і нячуваны палітычна - нацыянальны ўціск. Гэта зьяўляецца яркім прыкладам, які характарызуе выраблеьне сацыяльных і нацыянальных пытаньняў у сыстэме капіталізму, пры дыктатуры пралетарыяту, і ў сыстэме капіталізму, пры дыктатуры контр - рэвалюцыйнай буржуазіі і іх аванкурсу—фашызму і сацыял - фашызму.

Інтэрнацыянальная дэлегацыя пісьменьнікаў прыме ўсе меры для таго, каб паказаць перад шырокай пралетарскай грамадзкасьцю сваіх брацкіх рэспублік буйнейшыя дасягненьні беларускага пралетарыяту пад кіраўніцтвам партыі ў барацьбе за сацыялізм. Дэлегацыя будзе спрыяць за ўзмацненьне культурнай сувязі паміж брацкімі нацыянальнымі рэспублікамі Савецкага Саюзу, за іх ня толькі культурнымі дасягненьнямі, але і ўзаемным прыцягненьнем пісьменьнікаў і настаўнікаў да скарэйшага Магнітабудаў пралетарскага мастацтва на матар'яле барацьбы пралетарыяту ўсіх народаў нашага Вялікага Саюзу.

Члены інтэрнацыянальнай дэлегацыі пісьменьнікаў з новым запасам радасьці і энтузіязму, агромкным ад перамог будаўніцтва сацыялізму ў Беларусі, накіруюцца ў розныя канцы Савецкага Саюзу, каб перадаць баявое бальшавіцкае прывітаньне ад беларускага пралетарыяту, пралетарскіх пісьменьнікаў і работнікаў мастацтва—пралетарыяту брацкіх народаў і сваёйнічаць яшчэ больш моцнай культурнай сувязі паміж Савецкай Беларусьсю і іншымі брацкімі народамі СССР.

С. Амаглобэлі, Г. Бухнікашвілі, О. Вішня, О. Дасьвітны, М Дзяпроўскі, Б. Жгенці, А. Маранэйчук.

На добрускай папяровай фабрыцы пушчаны ўсе машыны

ВСНГ СССР зацьвердзіў вытворчую праграму добрускай папяровай фабрыкі на 1932 год у 23 тыс. тон. Гэта праграма пакладзе фабрыку на 30-40 проц. вытворчай магчымасьці. На вытворчай нарадзе раённых высунулі сустрэчны плян у 31,5 тыс. тон. 27-га студзеня пушчаны яшчэ дзьве машыны, прадукцыйнасьцю ў 7 тон у суткі кожная. Выпушчана паперы 70.189 кгр. — 12[illegible] проц. штатнага заданьня.

29-га студзеня пушчаны апошнія машыны. Рэканструяваны завод.

Тэрыторыя ваенных дзеяньняў пашыраецца

БАМБАРДЫРОУКА ШАНХАЮ, НАНКІНУ, СВАТОУ, ЧЫФУ

У Шанхай прыбываюць дзьве новыя японскія дывізіі

Баі ў Шанхаі

ТОКІЁ, 3. Сімбун Рэнга паведамляе з Шанхаю, што японскія войскі артылерыйскай страляніной эруйнавалі вялікую частку ўмацаваньняў, узведзеных кітайскімі часьцямі ў Чапеі. Пад вечар стральба спынілася. Баі ад'ехаліся сёньня ў 10 гадзін раніцы. Кітайскія снарады, як паведамляе агенцтва, быццам разьбілі частку будынку штабу японскага дэсанту, таксама пашкодзілі японскі браніны аўтамабіль. **Баі працягваюцца з удзелам японскіх самалётаў.**

Пасылка 2-х новых дывізій у Шанхай

ТОКІЁ, 2. З аўтарытэтных крыніц перадаюць, што рада міністраў зацьвердзіла пастанову ўчарайшай нарады (Осума, Араекі і Іосізава) аб пасылцы пяхоты ў Шанхай. У першую чаргу будзе адпраўлена каля 2-х дывізій.

Бамбардыроўка Усуна

ТОКІЁ, 3. Японскія ваенныя судны сёньня раніцой пачалі бамбардыроўку кітайскай цытадэлі ва Усуне (дзесьці порт на поўнач ад Шанхаю).

Паветраная бамбардыроўка Нандао

ШАНХАЙ, 3. Учора ў Нандао (раён кітайскай часткі Шанхаю) узьнікла панька з прычыны выбуху бомбы. Адначасова пад гэтай часткай горада крукуёся японскі аэраплян. На ўсіх вуліцах неадкладна былі зробены барыкады з мяшкоў з пескам. Кітайцы пачалі эвакуявацца. Вуліцы ахоўваюцца салдатамі, якія робяць побыскі ў праходных. Жыхаром забаронена пакідаць на вуліцы ад 6 гадз. вечара да 7 раніцы. Кітайскія снайпэры зноў напалі на памяшканьне японскага консульства, якое абараняецца японскімі маракамі і брыдзкімі маўнкамі. Кулямёты з японскіх суднаў, якія стаяць недалёка ад консульства, адкрылі агонь па снайпэрах. Сем'і консульскага персаналу эвакуюцца.

Акупанты налажылі сваю лапу на Чыфу

ШАНХАЙ, 3. З Чыфу паведамляюць аб трывозе сярод улады і насельніцтва. Згодна патрабаваньня камандзіра японскага зьнішчыцелі, **антыяпонскія арганізацыі закрыты. Ваенная ўлада рэквізуе для ваенных патрэб грузавыя машыны і мулаў.** Кітайскія ўлады эвакуюць свае сем'і.

(ТАСС).

Японскае камандаваньне адкінула патрабаваньне муніцыпалітэту сэтльмэнту

ТОКІЁ, 3. Згодна паведамленьня агенцтва Сімбун Рэнга з Шанхаю, **японскія войскі адхілілі патрабаваньне муніцыпалітэту спыніць ваенныя дзеяньні на тэрыторыі сэтльмэнту.**

Узброеныя сілы імпэрыялістаў у Шанхаі

ШАНХАЙ, 3. Па прыбыцьці ў Шанхай накіраваных тупы ўзброеных сіл з Батавіі, Манілы, Ганконга і Індакітаю, агульная колькасьць замежных войск, ня лічачы японскіх, будзе складаць **19.000 чал.** пяхоты і маракоў, з іх **амэрыканскіх 3.200 чал.** пяхоты і **3.000 маракоў, ангельскіх — 3.500 пяхоты і 6.000 маракоў, францускіх — 2.400 пяхоты і 1.000 маракоў.**

Рэзкая нота пратэсту

ШАНХАЙ, 3. Амэрыканскі, брытанскі і італьянскі консулы, старшыня муніцыпальнай рады, камандуючыя брытанскімі і амэрыканскімі сіламі, а таксама начальнік паліцыі сэтльмэнту зьвярнуліся да японскіх морскіх улад **з рэзкай нотай пратэсту супроць умяшаньня патруляў японскіх маракоў у работу чужаземнай паліцыі** і чужаземных войск у сэтльмэнце. Муніцыпальная рада дамагаецца неадкладнага адпаўленьня сваіх правоў па выкананьні ўсіх муніцыпальных функцый у раёне Хонку.

(ТАСС).

Верапомства акупантаў

ШАНХАЙ, 3. Учора, ня глядзячы на тое, што заявы аб спыненьні перамір'я зроблена ня было, **японцы адкрылі моцны артылерыйскі агонь па Чапею. Бамбардыроўка працягвалася звыш 4-х гадзін.** Некалькі 6-дзюймавых і лёгкіх гармат разьмешчаны ў розных пунктах раёну Хянкі, адкуль японцы абстрэльваюць кітайскія пазыцыі. Кітайскія сілы ўвесь час адказваюць.

Японцы сьцьвярджаюць, што кітайскія пазыцыі ўжо разгромлены і кітайскія часьці ўцяклі, але разам з тым японскія войскі з невядомых прычын, не прасунуліся і не акупавалі Чапею, чаго чакалі сёньня. Мэр кітайскай часткі Шанхаю заявіў, што ўчора японскі консул паведаміў яго, што Токіё ня прымае ўмоў перамір'я. Адначасова з гэтым **японскія войскі пачалі новую бамбардыроўку.** Таму мэр усклада адказнасьць за аднаўленьне баёў на японскае камандаваньне. Згодна японскіх паведамленьняў, 120 стрэлаў, зробленых з палявых гармат, цалкам зьнішчылі і эруйнавалі кітайскія пазыцыі.

(ТАСС).

Амэрыканскія банкіры ўхваляюць палітыку акупантаў

НЬЮ-ЕРК, 2. Газэта «Уорльд тэлеграм» піша: Банкіры адмаўляюцца тавярыць публічна і ў прыватным парадку **ўхваляюць палітыку Японіі ў Кітаі.** Захват Манчжурыі не выклікае сур'ёзнай крытыкі. Да атакі на Шанхай адносіцца цярпліва. Адначушна выступаюць супроць усякай інтэрвэнцыі ПАЗШ.

Японскія „цывілізатары"

ШАНХАЙ. Кітайскімі ўладамі арыштован кітаец, які на допыце прызнаўся, што яго падкупілі японцы, схапіўшы да падпалаў многіх будынкаў, якія знаходзяцца блізка і ззаду кітайскага фронту. У часе абстрэлу Чапея **зруйнавана ўсходняя бібліятэка, у якой хавалася каштоўнейшая ў сьвеце калекцыя кітайскіх кніг.**

АДКРЫЛАСЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ ПА „РАЗЗБРАЕНЬНІ"

ЖЭНЭВА, 3. (Спэцкор. ТАСС). Учора адкрылася ўступная прамовай Гендэрсона канфэрэнцыя па разбраеньні. Адкрываючы канфэрэнцыю ў момант, калі пакт па прызнаньні буржуазных палітыкаў небясьпека новай імпэрыялістычнай вайны зьяўляецца найбольш актуальнай з часу сканчэньня сусьветнай вайны, старшыня канфэрэнцыі, лідэр II-га Інтэрнацыяналу Гендэрсон ухітрыўся абыйсьці пытаньне аб вайне на Далёкім Усходзе і абмежаваца ўказаньнем, што канфэрэнцыя пачынаецца ў момант, калі на Далёкім Усходзе стварылася «цяжкая сітуацыя».

Таксама Гендэрсон абыйшоў маўчаньнем савецкі праект разбраеньня і савецкі праект пакту аб эканамічным непадпадзе, якія зьяўляюцца адзінымі прапановамі, накіраванымі на сапраўднага, а ня слоўнага забесьпячэньня міру. Нарэшце, Гендэрсон ні слова не сказаў аб найгольшых супярэчнасьцях у пытаньні аб разбраеньні паміж асноўнымі капіталістычнымі дзяржавамі.

Такім чынам, Гендэрсон у самым пачатку канфэрэнцыі пасьпяшыў яшчэ раз пацьвердзіць, што **аб поўным разбраеньні наогул на можа быць і гутаркі.** Нават у буржуазных журналістскіх колах адзначаецца, што прамова Гендэрсона пасіла вельмі агульны характар і змазвала **усе вострыя куты існуючых імпэрыялістычных супярэчнасьцяй.**

* * *

ЖЭНЕВА, 2. (Спэцкор. ТАСС). Большасьць дэлегацый на канфэрэнцыю па разбраеньні ўжо зьехалася. Паводле даных сакратарыяту Лігі нацый, на канфэрэнцыю прыбыла ўжо каля 1.500 дэлегатаў ад розных краін і каля 500 карэспандэнтаў буржуазных газэт. Памёр вялікай колькасьці міністраў, якія прымаюць удзел у канфэрэнцыі ад 63 краін, з ліку прадстаўнікоў буйнейшых краін прыбылі пакуль толькі з Англіі—Томас, з Францыі—Тардзе, з Італіі—Грандзі.

Характэрна, што напярэдадні адкрыцьця канфэрэнцыі ангельская дэлегацыя адслужыла набажэнства, на якім у чытаньні «священного писания» **першым прыняў удзел лідэр II-га Інтэрнацыяналу, сучасны старшыня канфэрэнцыі Гендэрсон.** Нават сярод удзельнікаў канфэрэнцыі па разбраеньні, якая сёньня адкрываецца, пікавасьць да яе адцясьнёна на задні плян далёка-ўсходнімі падзеямі.

* * *

БЭРЛІН, 3. Паводле паведамленьня з Жэнэвы канфэрэнцыя адкрылася ў абстаноўцы падзвычайнага замяшаньня. Вайна на Далёкім Усходзе кідае жудасны цень на канфэрэнцыю. Жэнэўскі карэспандэнт «Фосіше цэйтунг» зазначае, што «далёка-ўсходні клімат вельмі шкодны для Лігі нацый і што ў першы-ж дзень канфэрэнцыя вельмі пацярпела ад яго». (ТАСС).

У краіне шыбеніц і ваенна-палявых судоў

Масавыя арышты ў Сьвяньцянскім павеце

ВАРШАВА. Згодна паведамленьня друку, палітычная паліцыя быццам ліквідавала ў Сьвяцянах некалькі камуністычных ячэек. **Арыштавана 18 чалавек** па абвінавачаньні ў камуністычнай дзейнасьці. У вёсцы **Янковічы,** Сьвяцянскага павету, **арыштавана 7 селян,** абвінавачаных у прыналежнасьці да кампартыі Заходняй Беларусі.

Новы рэвалюцыйны пасол у польскім сойме

ВАРШАВА, 1. На месца выданага суду посла рэвалюцыйнай Сялянскай ініцыцы «Самапамога» тав. Ткачова, крайноў незаможны селянін **Францішак Блашкевіч,** з вёскі Кэмпа-Котэцка, Пулаўскага павету, Люблінскага ваяводзтва.

Наступленьне прадпрыемцаў разгортваецца па ўсім фронце

ВАРШАВА, 2. Наступленьне прадпрыемцаў Верхняй Сілезіі на жыцьцёвы ўзровень рабочых **разгортваецца па ўсім фронце.** Побач са зьнижэньнем зарплаты шчэ запатых на вытворчасьці рабочых, скарачэньнем вытвораў і г. д., **праводзяцца новыя масавыя звальненьні** на капальных і мэталюргічных заводах.

* * *

ВАРШАВА. Міністэрства працы Польшчы канчаткова зацьвердзіла пастанову арбітражнай камісіі аб зьнижэньні зарплаты верхня-сілескім гарнякоў на **8-10 проц.** з 1-га студзеня.

Ваенная „гульня" ў Вільні

ВАРШАВА, 3. Згодна паведамленьня польскай прэсы, маршал Пілсудзкі прыбыў 2 лютага ў Вільню ў сувязі з наладжаньнем **ваеннай гульні для вышэйшых афіцэраў.**

Подзімская забастоўка сарвана

ВАРШАВА, 2. Забастоўка лодзінскіх трамвайшчыкаў, якая пачалася 2 тыдні, сарвана. 30 студзеня супольнымі намаганьнямі выступаўшых **адзіным фронтам штрэйкбрэхэраў, сацыял-фашыстаў і адміністрацыі.** У сувязі з гэтым сарвана таксама ўсагульная забастоўка салідарнасьці лодзінскіх тэкстыльшчыкаў, якая намячалася 1 лютага.

(ТАСС).

Памёр селянін з голаду

ВІЛЬНЯ, 1. На полі бліжа вёскі **Ашмянка,** каля Ашмян, знойдзен труп **Сьпірыдона Гулецкага** — селяніна, які пасьля зруйнаваньня яго гаспадаркі жыў у страшэннай галечы. Доктарская сьледчая камісія сьцьвердзіла, што Гулецкі **памёр ад голаду.**

За павышэньне ўраджайнасьці сацыялістычных палёў

(Да нарады пры Беларускай Акадэміі Навук)

Сёньня адкрываецца нарада пры Беларускай Акадэміі Навук па пытаньні—«Уплыў кліматычных умоў зімы на становішча пасеваў і выпрацоўка практычных мерапрыемстваў па заканчэньні і ўдзеле ўраджайнасьці».

На нарадзе будуць заслуханы даклады: запальнай абожжавай станцыі, прафэсара **Кайгародава,** прафэсара **Максімава,** прафэсара **Афанасьева.**

Ужо адно скліканьне Акадэміяй Навук самой нарады, пастаноўка праблемы барацьбы за ўраджай, калектыўная распрацоўка практычных мерапрыемстваў сьведчаць аб тым, што пасьлядоўныя станцыі, навуковыя работнікі пачынаюць падыходзіць да вырашэньня сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі БССР, да вырашэньня цэнтральнай задачы, пастаўленай партыяй,—барацьбы за павышэньне работы, ўзьдыму ўраджайнасьці, арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

Сельская гаспадарка Савецкага Саюзу, як самая буйная гаспадарка на ўсім сьвеце, на падставе калектывізацыі і машынізацыі мае ўсе магчымасьці, усе ўмовы для найлепшага ўдасконаленьня на прыроду, выкарыстаньня і апрыманьня большага багацьця, ураджаю ад нашых палёў. Навука, апратэхніка павінна быць цалкам пастаўлена на службу інтарэсам пралетарскай дыярэкцыі, сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

У мінулым годзе БССР недаатрымала дзесяткаў тысяч тон збожжа. У некаторых калгасах і саўгасах ад выправаньня і вымачкі загінулі амаль усе азімыя пасевы. Перамоганне кардэ зімы асабліва ўдзейнічала на некаторыя гатункі жыта, як менш акліматызаванага. Таму перад нарадай БАН павінна быць пастаўлена, як адна з першачарговых задач,—**падбор адпаведных гатункаў насеньня.** Выходзячы з глебавых і кліматычных умоў для кожнай зоны, нават кожнага раёну, саўгасу і калгасу трэба сказаць, дзе і якім насеньнем можна сеяць. Улічыўшы **усе** дасягненьні навукі, пасьлядоўныя станцыі павінны спусьціцца ў нізоўку, перанесьці свае лепшыя вопыты непасрэдна ў саўгасы і калгасы.

Трэба спадзявацца, што нарада Беларускай Акадэміі Навук намеціць рад практычных мерапрыемстваў, якія будуць **ажыцьцёўлены ў 1932 годзе.**

За нарадай па пытаньні ўплыву зімы на ўраджай павінна пасьледаваць нарада па пытаньні ўплыву ўраджайнасьці тэхнічных культур, паляпшэньні парод жывёлы, арганізацыі працы ў калгасах і г. д.

На аснове замацаваньня посьпехаў конкурсу спараных брыгад змагацца за новыя перамогі

Множыць вопыт перадавых

Закончаны ўсесаюзны і ўсебеларускі конкурсы па лепшую спараную брыгаду. 56 лепшых брыгад па ўсесаюзным конкурсе і 12 па ўсебеларускім прышлі да фінішу.

Лепшая брыгада **Падрубаева і Нішчых** (Пермская чыгунка) заняла першае месца на ўсесаюзным конкурсе, выканала ўсе 11 умоў спаборніцтва. За сьнежань і студзень месяцы брыгада дабілася наступных выпікаў: прабег выканан на 183 проц., эканомія апалу—40,8 проц., прабег між прамыўкамі—100 проц., эканомія змазкі — 48 проц. За час спаборніцтва ня было ніводнага выпадку зрыву спаранай, ніводнага спыненьня для нагону пары. Сьледаваньне па раскладзе выканана на 100%. Нагон спазьненьняў якія былі па піне брыгады—5.419 мін. Усе паравозьнікі — камуністы, актыўныя грамадзкія работнікі.

Сёньня мы друкуем ліст гэтай брыгады ў газэту «Праўда», у якім яны дзеляцца вопытам барацьбы за 11 умоў спаборніцтва.

Па ўсебеларускім конкурсе першае месца па таварных паравозах заняла камсамольская брыгада **Досіна і Курыловіча** (дэпо Менск) і па пасажырскіх брыгада **Мельнікава і Хімакова** (дэпо Гомель). Другое месца па таварных паравозах заняла брыгада **Казлова і Сяргеева** (дэпо Гомель) трэцяе месца — брыгада **Жытковскага і Бурава** (дэпо Гомель), чацьвертае — **Рэбэнса і Багданава** (дэпо Полацак), пятае — **Сенажынскага і Зігдорчыка** (дэпо Жлобін) і па пасажырскіх паравозах другое месца заняла брыгада **Хахова і Зялёнка** (дэпо Жлобін), трэцяе месца — **Тарэлкіна і Дзямідава** (дэпо Гомель), чацьвертае — **Лазоўскага і Гарэлага** (дэпо Гомель), пятае — **Мельнікава і Праведнага,** шостае месца — **Бусьленка і Іваноўскага** (дэпо Менск) і сёмае — **Масько і Ветрава** (дэпо Менск).

Ва ўсесаюзны і ўсебеларускі конкурсы былі ўцягнуты амаль усе паравозьнікі чыгунак. У выніку конкурсаў значна павялічыўся сярэдні - суточны прабег паравозаў, дасягнута вялікая эканомія апалу, замацавана спараная, узмацнілася працоўная дысцыпліна і г. д.

13 лепшых брыгад чыгунак БССР за час конкурсу дабіліся наступных выпікаў: прабежная норма перавыкананна на 11.464 клм., з'эканомлена 236,1 тон апалу, 93 гадз. 56 мін. нагону спазьненьняў у дарозе і г. д.

Паказала добрыя ўзоры работы Гомельскае дэпо. У сьнежні карысная работа паравоза ў суткі па гэтым дэпо дасягнула 12,6 гадз., а ў першай дэкадзе студзеня — 12,2 гадз.

Чыгуначнікі БССР у дні конкурсу дасягнулі значных зрухаў па аздараўленьні паравознага парку. Задача заключацца ў тым, каб гэтыя посьпехі замацаваць і пашырыць. Вопыт лепшых паравозных брыгад павінен быць перададзены ўсім паравозным брыгадам БССР. Лепшыя брыгады павінны далей праводзіць барацьбу за новыя высокія паказальнікі, за бальшавіцкія рэкорды.

Транспарт яшчэ адстае ад агульных тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва. Барацьба спаранных брыгад за аздараўленьне паравознай гаспадаркі, за павялічэньне карыснай работы паравозаў, за эканомію апалу, за спаранную — ёсьць па сутнасьці барацьба за падцягваньне транспарту да ўзроўню перадавых галін народнай гаспадаркі. Перад транспартам у 1932 годзе пастаўлены яшчэ больш адказныя задачы, чым у 1931 г. Абавязак кожнага паравозьніка, кожнага чыгуначніка, пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі, біцца за выкананьне плану бягучага году.

Сацыялістычнае спаборніцтва, рэалізацыя шасьці ўмоў тав. Сталіна — магутны вагар перамогі ўсіх трудзящыхся на шляху аздараўленьня транспарту. Усе чыгуначныя арганізацыі павінны разгарнуць на аснове спаборніцтва спараных брыгад і пашырэньня посьпехаў, на аснове ўсіх чыгуначнікаў сацыялістычным спаборніцтвам.

Практыку работы лепшай брыгады СССР перанесьці на ўсе чыгункі БССР

Ліст пераможцаў па Усесаюзным конкурсе

Перамога на ўсесаюзным спаборніцтве абавязвае нас дабівацца яшчэ больш высокіх паказальнікаў, перадаваць нахоплены намі вопыт усёй масе паравозьнікаў. Паведамляем: вы сокіх паказальнікаў мы дабіліся таму, што ўсімі сіламі акружыцяўлялі ўказаньні тав. Сталіна.

Абязьлічка ў нас на паравозе ліквідавана поўнасьцю. За ўвесь час работы ў нас ня было ніводнага зрыву спаранай. Больш таго, кожны дакладна ведае свае абавязкі. **Мацьніст** пільна сочыць за добрым становішчам паравоза, за рамонтам, піадзе пяшчэ і кіруе работай кожнага з брыгады. **Памочнік машыніста** аглядае і правярае становішча агнявой топкі, змаз вае часткі, якія трудна, сочыць за чыстатой і выразна выконвае заданьні машыніста. **Качагар** адказвае за чыстату тапла і будкі, сочыць за добрым станам сыгнальных ліхтароў, змотвае і падкідвае вугаль.

Абязьлічка, якая была ў дэпо, таксама пачынае зьяўляцца ў сувязі з сацспаборніцтвам. Расстаноўка сіл цэлер робіцца так, каб кожны сьлесар, кацельшчык адказваў за сваю работу і каб быў захаваны прынцып адзінаначальня. Складаецца дакладны графік работ, які абвяшчоўваецца рабочымі, імі высоўваецца сустрэчны плян. У рэзультаце процант хворых паравозаў зьнізіўся замест 22 у сьнежні да 13,6 проц. у пачатку сьнежня, а 20 студзеня ён вынаходзіцца ў 6,8 проц.

Гаспадарчы разрахунак. На гэтай аснове мы дабіліся эканомнага і рацыянальнага вядзеньня справы. У сьнежні мы з'эканомілі 42,2 проц. апалу, а за 25 дзён студзеня—39,4 проц. Значную частку рамонту праводзім самі, для чаго выкарыстоўваем ня толькі знаходзяцьяе паравоза ў дэпо на прамыўцы, але і ў цэху.

Кадры. Выконваючы лёзунг тав. Сталіна і пастанову кастрычніцкага пленуму ЦК, мы ўзьнімаем кваліфікацыю брыгадзіраў. Качагар Шумілаў, у пачатку-ўсяём ня вопытны, прыйшоўшы на паравоз, пасьля некалькіх месяцаў работы ўжо атрымаў высокую кваліфікацыю. Зараз мы рыхтуем яго ў памочнікі мацьніста. Памочнік мацьніста памагае паравоза тав. **Мосунаў,** пасьля сканчэньня ўсесаюзнага спаборніцтва, будзе трымаць экзамэн на мацьніста цягнікоцкага паравоза.

Аўладаньне тэхнікай. У часе сталінскі паравоза для прамыўкі ў дэпо партыгрупа праводзіць вытворчыя нарады, абмяркоўваючы тэхнічныя пытаньні неабходнага рамонту, эканомі, перадае адна другой свае веды і вопыт.

Мы не абмяжоўваемся па гэтых парадах толькі вытворчымі пытаньнямі. У партыйнай групе мы абмеркавалі ліст тав. Сталіна, прапрацавалі яго прамову аб 6 умовах. Наша перамога — рэзультат практычнага ажыцьцяўленьня бальшавіцкай праграмы.

У нашай групе былі 2 беспартыйныя: качагар Рагозін і нам. мацьніста Мосунаў. У перыяд падрыхтоўкі да XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі яны абодва ўступілі ў партыю. Згуртаваўшыся ў адзіную камуністычную брыгаду, мы па-баявому разгарнулі работу партгрупы. Наш парторг Падрубаеў вельмі добра спалучае веды вытворчасьці з умелым кіраўніцтвам партыйна-масавай работай на паравозе.

Ократар парткому Пяпкоў быў актыўным памочнікам у нашай рабоце, ён кіраваў спаборніцтвам, клапаціўся, каб своячасова быў зроблен тэхнічны агляд, каб дыспэтчары не затрымлівалі паравоз у дарозе.

Таксама актыўна дапамагалі: памочнік дзяжурнага дэпо Міхеєў, майстар Дабарскі, намесьнік начальніка дэпо Нікалаеў; яны ўсялякі садзейнічалі добрай прамыўцы паравоза і яго звароту.

Спаборніцтва паказала, што наш транспарт мае вялізарныя магчымасьці. Сьледуючы нашаму прыкладу, дзесяць паравозных брыгад сталі перавыконваць вытворчыя паказальнікі. Асабліва бліскучых посьпехаў дабілася брыгада мацьністаў Кавалеўскага і Адзінцова. Іх паравоз у сьнежні зрабіў 5.097 клм. замест даных 5.636 клм. За 20 дзён студзеня зроблена 3.166 клм. замест 2.424 клм. Падцягнуліся і некаторыя адстаючыя брыгады. Паравоз мацьніста Мартышава і Качова ў сьнежні зрабіў замест 3.616 толькі 3.212 клм., а за 20 дзён студзеня—замест 2.410 клм. ён выканаў 2.524 клм.

Першае ўсесаюзнае спаборніцтва паравозных брыгад скончана, але барацьба за аздараўленьне паравоза і ўсяго транспарту праводзіцца далей.

Спаранная брыгада паравоза Э. У. —710: **Падрубаеў, Нішчых, Масуноў, Фрыцчын, Шумілаў, Рагозін.**

(«ПРАЎДА»).

Прывітаньне ад ЦК УсеКП(б) т. Кржыжаноўскаму

Старому бальшавіку, паплечніку Леніна, аднаму з першых пікнэраў электрыфікацыі СССР—**тав. Кржыжаноўскаму** ЦК УсеКП(б) шле гарачае прывітаньне ў дзень 60-годзьдзя.

ПАБУДОВА ПЕРШАГА САВЕЦКАГА ЗВАРНАГА ТРАЎЛЕРА

ЛЕНІНГРАД. На паўночнай суднабудаўнічай верфі пачата пабудова першага савецкага зварнага траўлера. У 1932 г. **плянуецца выпусьціць 5 траўлераў,** цалкам зробленых пры дапамозе электрасварцы.

Прывітаньне ад ЦК УсеКП(б) т. Пятніцкаму

У дзень 50-годзьдзя ЦК УсеКП(б) шле гарачае бальшавіцкае прывітаньне **т. Пятніцкаму,** выпрабаванаму ў баёх, старому бальшавіку, аднаму з лепшых кіраўнікоў міжнароднага камуністычнага руху.

„КРАСІН" РЫХТУЕЦЦА ДА НОВАГА ПАЛЯРНАГА ПАХОДА

ЛЕНІНГРАД. У Ленінградзкім гандлёвым порце ідуць работы па падрыхтоўцы «Красіна» ў новы палярны паход.

На «Красіне» будуецца спэцыяльная плятоўка для ўстаноўкі самалёта.

Апошнія навіны з фронту індустрыялізацыі

На рашаючых вучастках МЭТАЛЬ.

За 31 студзеня па ўсіх мэталюргічных заводах СССР выплаўлена 17.055 тон чыгуну і 13.811 тон сталі (без малой мэталюргіі).

ВУГАЛЬ. За 2 лютага ў Данбасе здабыта 131.137 тон вугалю. У параўнаньні з мінулым днём, здабыча вугалю на Данбасе зьнізілася, што тлумачыцца сьнежнымі заваямі. Па ўсім Саюзе здабыта 183.943 тоны вугалю.

Скончан мантаж домны КУЗЬНЕЦКБУД.

Да XVII партканфэрэнцыі мантажнікамі доменнага цэху скончан мантаж домны № 1. Поўнасьцю гатоў да эксплёатацыі рудны двор, скончана электрападстанцыя: Ужо праведзена паляпшэнне выпрабаваньне каўпераў, паветрапроводаў, газапроводаў; выпрабаваны каўшы для чыгуну.

Выраб штучнай воўны

На ленінградзкай фабрыцы «Пятилетка», якая выпрацоўвае штучны шоўк, пускаецца новы цэх, які ўпершыню ў СССР будзе выраблять штучную воўну.

ВЫПУСК ПЕРШАГА САВЕЦКАГА АЎТАГУДРАНАТАРА

ЛЕНІНГРАД. На дзецка-сельскім рамонтным механічным заводзе ўзарнымі брыгадамі т. Данілава і Паўленкі выпушчан у падарунак аб'ядкаваў IV-й абласной і гарадзкой партканфэрэнцыі першы савецкі аўтагудранатар (машына для паперыцыя «чорных» дарог бітумам), сканструяваны інжынэрам Обухавым. Машына пабудавана з савецкіх матар'ялаў і ўстаноўлена на пяцітоннай яраслаўскага заводу. Выпрабаваньне аўтагудранатара дало зусім здавальняючыя рэзультаты.

Работа заводу імя Варашылава

За дзьве дэкады студзеня **завод імя Варашылава** выпусьціў сьвіпрэвальных варштатаў 25 штук — 25 проц. месячнага заданьня, кампэндрабілак — 6, або 120 проц., цэнтрафуг —7 шт., або 140 проц., гравіясартовак — 10, або 14 проц.

Выраб лесаматар'ялаў

За студзень Нова-Барысаўскі дрэваапрацоўчы камбінат «Камінтэрн» выканаў сваю вытворчую праграму па лесапіленьні на 119,51 проц. і па фанэры—на 85,11 проц.

Гарбарня „Бальшавік" узорна змагаецца за прамфінплян

За пятую пяцідзеўку студзеня **гарбарня «Бальшавік»** выканала сваю вытворчую праграму на 103,8 проц.; па першым хромавым цэху—на 104,25 проц., па другім — на 103,43 проц.

Вытворчая праграма гарбарні за 25 дзён студзеня выканана на 105,43 проц. Першы хромавы цэх даў 105,39 проц., другі — 105,46 проц.

Бабруйскі камбінат перавыконвае заданьні

За пятую пяцідзеўку студзеня **Бабруйскі дрэваапрацоўчы камбінат** выканаў па расьпілоўцы сыроду — 100,3 проц. праграмы, па лесазаводзе № 6 — 100,2 проц., па фанорным цэху—93,3 проц., беларпроўным — 105,1 проц., па цэху стандартных дамоў — 112,5 проц.

ПЕРШЫ У САЮЗЕ ПАКАЗАЛЬНЫ ТЭХПЛЯН

ЛЮБЯРЦЫ. На любярэцкім заводзе пры шырокім удзеле рабочых складзен першы ў Саюзе паказальны тэхплян. У тэхплян уключаны важнейшыя тэхнічныя меры, якія дапамагаюць шпарчэйшаму выкананьню вытворчага пляну. Правядзеньне тэхпляну дае за паўгода больш 2 млн. руб. эканоміі.

На Добруской фабрыцы

2 лютага на добрускую папяровую фабрыку «Герой працы» падана 75 тон торфу. Прастой пяці машын скла дае 54 гадзіны. Паперы выпрацавана 22.276 клг., або 30,9 проц. сутачнага заданьня.

На 10 проц. звыш пляну

За 1 лютага **швэйная фабрыка імя Валадарскага** выканала сваю вытворчую праграму на 110 проц. Па асартыменце паўчаліто—на 98 проц. па вопратцы—на 222,5 проц. па сукнах—на 141,3 проц.

12 тысяч р. эканоміі

Окуранай сэкцыяй навукова-даследчага інстытуту прамысловасьці БССР скончаны досьледы як у лябараторыі, так і ў паўзаводзкім маштабе скарыстаньня торфу пры варыцы хромавых экстрактаў. Гэта мерапрыемства дасьць магчымасьць з'эканоміць прыблізна 12.000 руб. у год выключна па адным заводзе «Бальшавік».

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

Паведамленьні

— 5 лютага, у 7 гадз. веч., у залі Акадэміі Навук адбудзецца закрыты сход партыялектыву Беларускай Акадэміі Навук. Яўка ўсіх камуністаў, што знаходзяцца ў Менску, абавязкова.

— 5 лютага, у 7 гадз. веч., у Доме Асьветы ў сэцыі партасьветы партыялектыву прадасьветы будуць праводзіцца тэзісы XVII партканфэрэнцыі. Яўка партыйнай і камсамольскай абавязкова. Запрашаюцца беспартыйныя.

— Сёньня, 5 лютага, у 7 гадзін вечара, у памяшканьні рэдакцыі «Чырвонай зьмены» (Карла Маркса, 38) склікаецца сход літаратурнай брыгады «Чырвонай зьмены». На парадку дня —абгаворваньне новай п'есы тав. І. Гурскага «Новы горад». На абгаворваньне п'есы запрашаюцца: камсамольскі актыў, пісьменьнікі, літаратуразнаўцы, юнкоры, трамаўцы, работнікі мастацтва.

7-га лютага, у 12 гадз. дня, у габінэце начальніка станцыі Менск-пасажырская,

склікаецца

НАРАДА ПА ПЫТАНЬНІ ВЫПРАЦОЎКІ ЛЕТНЯГА РАСКЛАДУ РУХУ ПРЫГАРАДНЫХ ЦЯГНІКОЎ.

Просьба да ўсіх арганізацый, устаноў, фабрык і заводаў камандыраваць сваіх прадстаўнікоў на гэту нараду са сваімі меркаваньнямі аб колькасьці неабходных прыгарадных цягнікоў на летні час і пажаданы расклад руху.

Нам. начальніка станцыі Менск—**ПАЛКОВІЧ.**

Кіно „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"

Ад пятніцы 6 лютага

Новы мастацкі гукавы сінхронны фільм вытворч. Саюзкіно

ПОБАЧ з НАМІ

Пастаноўка рэжысэра Н. Браўко.
Мастак—В. Ягораў.
Кампазытары—М. Старавойтэнка і Л. Пэлавінкін.
Аператар—В. Салодоўнікаў.

У ГАЛ. РОЛЯХ:

КАШЭВІЧ—арт. тэатру б. Корш—И. М. БАРТАШЭВІЧ.
СТАРШЫНЯ СУДА—арт. МХАТ І В. БЯРЫЦКІ.
САЦЫЯЛ-ФАШЫСТ—арт. тэатру МОСПС А. БАХІЦЕЦЦЕЎ.
КАМСАМОЛЬЦЫ: Ніра Салаўёва. А. Ахрамеяў. М. Сідорчык.

ШТОДЗЕННА 5 СЭАНСАЎ.

ПАЧАТАК: дадатк. сэанс. у 4 гадз. 30 м.
I " 6 гадз.
II " 7 гадз. 30 м.
III " 8 гадз.
IV " 10 гадз. 30 м.

КАСА—АД 1 ГАДЗ. ДНЯ.

Дзеці да 10 год у кіно НЕ ДАПУСКАЮЦЦА.

Асобы, якія спазьніліся, на сэанс не дапускаюцца.

„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" Каса—ад 12 г. дня. Вялікі мастацкі фільм **ЦІХІ ДОН**

„ПРАЛЕТАРЫ" Каса—ад 12 г. дня **3-я МЯШЧАНСКАЯ** (Каханьне ўтрох) у 7 частках

„СПАРТАК" Пачатак сэансаў: 7 г., 9 г. і 11 г. Апошняя, 2-я серыя **НІБЭЛУНГІ** (Помста Крымгільды) у 10 ч. Каса—з 12 г. дня.

Дырэкцыя Мікрабіялёгічнага інстытуту даводзіць да ведама ўсіх запісаўшыхся лекавых установаў і асоб, што з **8 лютага 1932 г.** вытворчасьць клініка-дыягнаст. досьледаў (аналізаў) у інстытуце спыняецца. Апошнія будуць вытвараццa **ў 3-й гарадзкой свецкай амбуляторыі** (РАКАЎСКАЯ, 13) з 12 лютага 1932 г.

З 8 лютага па 12 лютага аналізы вытвараццa ня будуць, у сувязі з перадачай лябараторыі.

Сералёгічныя і бактэрыялёгічныя досьледы будуць, як і раней, вытвараццa інстытутам.

ДЫРЭКЦЫЯ ІНСТЫТУТУ.

Беларускі Дзяржаўны тарфяны Інстытут у складзе аспірантацыйнага, мэханічнага, хімікатэхналёгічнага, мэханіка-тэхналёгічнага і эканамічнага аддзяленьняў, адкрывае з 15-II—32 г.

8-месячныя КУРСЫ вячэрнія

без адрыву ад вытворчасьці для рабочых і калгасьнікаў па падрыхтоўцы асьненьня набору на вышэйшае заканчэньне аддзяленьні інстытуту.

На курсы прымаюцца асобы з асьветай ня ніжэй 6 груп сэмігодзі.

Прыём заяў у канцылярыі тарфінстытуту (Менск, вул. Карла Маркса № 37) да 10 лютага штодзенна ад 9 да 4 г. дня і ад 7 да 9 г. вач.

Дакумэнты прадстаўляюцца згодна даведкам НКА ў арыгіналах.

Інтэрнаты і стыпэндыі ня служаць не забясьпечваюцца.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Менск, друкарня «Зьвязды» Галоўлітбел № 327.